

ВАРЭННЕ — СТРАВА ПАНСКАЯ! 5

ТЭАТР — ЯК ЛЮСТЭРКА... ПЕРАД ГРАМАДСТВАМ 8





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЛЮТАГА 2020 г. СУБОТА № 31 (29145)


З першых вуснаў

# ЭКАНОМІКА — ГЭТА ГАЛОЎНАЕ


Фота БелТА.

## Прэзідэнт запусціў вытворчасць сульфатнай беленай цэлюлозы на Светлагорскім цэлюлозна-кардонным камбінаце

**Кіраўнік дзяржавы працягвае асабіста знаёміцца з рэалізацыяй значных для краіны інвестпраектаў. У сэнсе паспяховасці Светлагорскі камбінат — самае значнае прадпрыемства ў цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Але кіраўнік дзяржавы ніколі не абмяжоўваецца вывучэннем спраў на нейкім адным аб'екце. Патрабаванне Прэзідэнта — «узварухнуць» горад, раён, таму службовыя асобы прыязджаюць раней і вывучаюць становішча. І да гэтага мусяць быць гатовыя ўсе рэгіёны краіны. Напярэдадні з дзясятак прадпрыемстваў Светлагорскага раёна наведалі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід Анфімаў і старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля Качанава.**

СТАР. 2

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў зварот да воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў вайны ў Афганістане з нагоды Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

«Разам з байцамі, жонкамі, дзецьмі салдат і афіцэраў, якія загінулі ў далёкім Афганістане, мы памятаем і смуткуем па сваіх земляках. Ганарымся мужнасцю і стойкасцю беларусаў, якія, праявіўшы гераізм і захаваўшы вернасць прысязе, сумленна выканалі свой воінскі абавязак», — гаворыцца ў звароце.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што дзесяцігадовы ўдзел у баявых дзеяннях абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў на афганскай зямлі ўжо тады паказаў, наколькі вялікія могуць быць геапалітычныя амбіцыі асобных краін і як высока цэніцца мір, стабільнасць і бяспека. «Гэтыя ўрокі актуальныя і цяпер, калі ва ўмовах разрастання міжнароднага тэрарызму і экстрэмізму адной з галоўных задач для нашай маладой суверэннай краіны застаецца захаванне і ўмацаванне незалежнасці, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Перакананы, што воіны-інтэрнацыяналісты і надалей будуць прыкладам адвагі і гонару для маладога пакалення абаронцаў нашай Радзімы».

# ПАМЯЦЬ СЭРЦА



Воін-інтэрнацыяналіст, адзін з першых кіраўнікоў афганскага руху ў нашай краіне Павел ШАЦЬКО ўзначальвае арганізацыю ветэранаў вайны ў Афганістане пры Маскоўскім раёне Мінска. 15 лютага, наведваючы Востраў слёз, я заўсёды сустракаю гэтага, з сумнымі вачыма, мужчыну з баявым ордэнам на грудзях. Павел Вадзімавіч, як і многія яго аднапалчане прыходзіць аддаць даніну памяці салдатам і афіцэрам, якія не вярнуліся з той неаб'яўленай вайны. Гэтую вайну Павел Вадзімавіч ведае, як ніхто іншы, бо не раз знаходзіўся пад агнём душманаў, страчваў сваіх саслужыўцаў. У пачатку 1983 года, пасля выканання чарговага задання, сам вяртаўся ў часць, але трапіў пад прыцэльны мінамётны агонь. Цяжкае раненне, страта рукі. Тады і вайна, і юнацтва для яго скончыліся. А да дэмабілізацыі заставалася ўсяго тры месяцы...

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

### КОРАТКА

- **Заснаваны юбілейны медаль да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**
- Дзяржпагранкамітэт і музей гісторыі ВАВ адкрылі фотавыстаўку пра воінаў-інтэрнацыяналістаў.

ISSN 1990 - 763X

Толькі лічбы

# «ПРОСТАЕ ШЧАСЦЕ ЛЮДСКОЕ...»

## Падведзены вынікі маштабнага абследавання хатніх гаспадарак

**У Беларусі, паводле звестак Белстата, каля 84 % хатніх гаспадарак выкарыстоўвае для ацяплення і прыгатавання ежы «чыстыя» — няцвёрдыя — віды паліва. Прычым у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу гэты паказчык вышэйшы за 95 %, у сельскіх населеных пунктах — крыху больш за 50 %. Больш за 90 % дзяцей ва ўзросце трох-чатырох гадоў ахоплены адукацыйнымі праграмамі для ранняга развіцця. У пачатковай школе большая частка малых лепш спраўляецца з чытаннем, чым з матэматыкай. А 68 % дзяцей бацькі дапамагаюць рабіць хатнія заданні, пры гэтым пісьменнасць моладзі складае 100 %. І нарэшце, доля тых, хто лічыць сябе адносна ці вельмі шчаслівым, складае 90 % сярод жанчын і 86 % сярод мужчын ва ўзросце ад 15 да 49 гадоў. Моладзь адчувае сябе яшчэ больш шчаслівай.**

У 2019-м Белстат правёў шосты раўнд шматіндыкатарнага кластарнага абследавання хатніх гаспадарак (МІКС 6). У Беларусі яно праводзілася трэці раз (папярэднія раўнды былі ў 2005-м і 2012-м). Даследчыкі вывучалі становішча жанчын і дзяцей у краіне, збіралі інфармацыю па больш чым 140 паказчыках. Каля 9 тысяч сем'яў (а гэта больш за 20 тысяч рэспандэнтаў) адказалі на дзясяткі розных пытанняў: ад доступу да электрычнасці і відаў паліва, якое выкарыстоўваюць, да асаблівасцяў выхавання дзяцей, ужывання алкаголю і адчування бяспекі і шчасця. Абследаванне праводзілася пры фінансавай падтрымцы Дзіцячага фонду ААН, Еўрапейскага саюза, Сусветнага банка, урада Расійскай Федэрацыі і Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці.

СТАР. 7

# ЭКАНОМІКА — ГЭТА ГАЛОЎНАЕ



Фота БелТА.

## Чырвоная кнопка замест стужкі

Напэўна, самай чаканай і ўрачыстай хвілінай на Светлагорскім цэлюлозна-кардонным камбінаце стаў момант, калі Прэзідэнт націснуў кнопку на пульце кіравання і тым самым урачыста запусціў вытворчасць айчыннай цэлюлозы.

Некалькі хвілін раней у цэнтры кіравання заводам Аляксандр Лукашэнка пазнаёміўся з працаўніком — ураджэнцам Егіпта, і парадаваўся, што жыхар поўдня прыжыўся ў Беларусі, ажаніўся з нашай дзяўчынай, з якой яны нарадзілі дзіця. Прэзідэнт паабяцаў узгадаць гэта знаёмства на наступным тыдні падчас паездкі ў Егіпет і нават расказаць калегу Абдэлю Фатаху Ас-Сісі.

Падчас знаёмства з тэхналагічным працэсам высветліліся абставіны, якія прымусілі Аляксандра Лукашэнку сумнявацца ў эканамічнай эфектыўнасці свабодных эканамічных зон.

«Які сэнс? Мы аддаём сыравіну нашу беларускую, ды яшчэ за бясцэнак, а ад прыбытку не атрымліваем. ***Нам трэба арыентавацца ўжо на нешта істотнае: калі ты жадаеш сюды прыйсці працаваць, калі ласка, прыходзь і працуй, як працуюць усе нашы прадпрыемствы, плаці ўсе падаткі. Працоўныя месцы — гэта для нас ужо не настолькі актуальна. Любыя працоўныя месцы мусяць прыносіць прыбытак»,*** — адзначыў Прэзідэнт. Не трэба чакаць міласцяў ад інвестара — трэба варушыцца самім. І новы завод добры таму прыклад.

**«Ваш Прэзідэнт ніколі не стане апошнім. Пасля мяне вы ўжо думайце, што вы будзеце рабіць. Калі я буду жыць і не буду Прэзідэнтам, я буду змагацца (не будучы Прэзідэнтам), каб наша Беларусь вось на гэтым кавалку зямлі заставалася суверэннай і незалежнай», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.**

Каб пазбегнуць экспарту сыравіны ці, як кажа беларускі лідар, «паўфабрыкату», канцэрн «Беллеспаперпрам» прапануе рэалізаваць у Светлагорску новы праект — па вытворчасці рулоннай прадукцыі для папяровай упакоўкі. Для гэтага ёсць і пляцоўка, і сто тысяч тон уласнай цэлюлозы, і попыт на знешнім рынку. Аб гэтым расказаў старшыня канцэрна Юрый Назараў.

«Да канца года максімум — чым раней, тым лепш, прапрацаваць гэтае пытанне. Любыя грошы мы знойдзем, гэтую машыну ўжо можна замаўляць. Але патаргавацца. ***Самая глыбокая перапрацоўка — гэта і ёсць рашэнне галоўнага пытання, на якім я настойваю: імпартазамяшчэння»,*** — даручыў кіраўнік дзяржавы.

Больш за тое, на заводзе магчыма ажыццяўляць аўтаномную вытворчасць хімікатэрмамеханічнай масы для яшчэ аднаго віду ўпакоўкі... з асіны і вольхі. Гэта таксама адно з даручэнняў Аляксандра Лукашэнкі: знайсці выкарыстанне для, здаецца, танных парод.

«Ну добрая ідэя! У нас жа кітайскіх крэдытаў шмат, у тым ліку не асвоеных. Гэта першае. Другое. Шчыра скажу: калі я сустракаюся, ніхто з заходніх не абмяркоўвае «правы чалавека», «дэмакратыю». Я іх заўсёды стаўлю перад фактам: эканоміка. Гандаль. Журналісты сышлі, камер няма — мы абмяркоўваем гэтыя пытанні. Гэта галоўнае. Потым будуць і правы чалавека, і зарплата будзе, і дэмакратыя», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Грошай на рэалізацыю новых праектаў у свеце велізарная колькасць, перакананы Прэзідэнт. Не абавязкова на гэты раз кітайскіх — хоць цана, заплачаная за досвед, таго вартая. ***«Мы шмат чаму навучыліся тут: як заключаць кантракты, як з імі працаваць, каб зноў потым гераічна недахопы не пераадольваць»,*** — прызнаў кіраўнік дзяржавы.

## Плюсы дададзенай вартасці

«Галоўнае цяпер — атрымаць большую дададзеную вартасць. Гэта і працоўныя месцы, і прыбытак, і падаткі ў бюджэт. Гэта ўсё тут. Гэта наша. І другое — мы павінны разлічвацца», — звярнуўся да кіраўніцтва канцэрна і завода Прэзідэнт.

Яму паведамілі, што сёлета прадугледжана вяртанне ў бюджэт 83 мільёнаў, летась выплачана каля 15 мільёнаў беларускіх рублёў. Да 2023 года плануецца вяртанне асноўнага доўгу, а канчатковы разлік — да 2028 года. Ёсць і новыя праекты, рэалізацыю якіх Аляксандр Лукашэнка ўхваліў: вытворчасць віскознай ніткі з высокімі спажывецкімі якасцямі і мэблевая вытворчасць.

У практыцы наведвання раёнаў краіны — заўсёдныя даклады аб становішчы ў рэгіёне і вобласці. Па выніках размовы кіраўнік краіны наведаў Светлагорскія завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый і домабудаўнічы камбінат — па-за планам, да чаго, уласна кажучы, пул гатовы заўсёды.

## Папера замест пластыку

Слова «экалогія» падчас учарашняй паездкі гучала шмат разоў. Аляксандр Лукашэнка гэта пытанне ўзняў першым.

«Я ўсё ж такі дацісну, каб мы прыбіралі пластык, а мянялі дзе толькі магчыма на паперу. Пластык жа колькі гадоў раскладаецца?.. А макулатуру перапрацаваў, назад аддаў. Таму я і цісну цяпер на гэта», — абазначыў сваю пазіцыю Прэзідэнт.

Дарэчы, наведваючы цэх і ўпраўленне камбіната, кіраўнік дзяржавы раз-пораз запытваўся аб «дрэннапахучых рэчывах», асабіста кантралюючы экалагічнае становішча на тэрыторыі.

«Выкарыстана самая сучасная сістэма адбелкі, без элементарнага хлору. Толькі на двух ступенях мы выкарыстоўваем дыяксід хлору, гэта зусім іншае рэчыва, якое не шкодна, і сёння фактычна 90 % прадпрыемстваў у свеце працуюць і будуюцца новыя па гэтай тэхналогіі», — паведаміў Прэзідэнту генеральны дырэктар камбіната Юрый Крук.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ЦКК — прадпрыемства поўнага замкнутага цыклу.

«Вы ваду ўзялі з Бярэзіны, выкарысталі, ачысцілі і зноў выкарыстоўваеце. Вы ачышчаеце ваду так, што яе пасля гэтага можна піць. ***Таму тут зроблена ўсё па высокіх стандартах, на якія толькі здольная сёння сусветная прамысловасць»,*** — крыху пазней адзначыць Аляксандр Лукашэнка супрацоўнікам прадпрыемства.

***

**Заключным пунктам знаходжання Прэзідэнта на камбінаце стаў склад, які часова ператварыўся ў імправізаваную актавую залу. Там кіраўніка краіны чакалі рабочыя прадпрыемства, каля 300 чалавек. Усяго на камбінаце працуюць больш за 2300 супрацоўнікаў. Дэлегаты на размове — найлепшыя з найлепшых. На пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы падзякаваў калектыву прадпрыемства за тое, што беларускія спецыялісты самі справіліся з асваеннем вытворчых магутнасцяў. «Вы, адмовіўшыся ад нядобрасумленнага выканаўцы, зрабілі гэта прадпрыемства самі. І атрымліваеце сёння добрую прадукцыю», — звярнуўся да працаўнікоў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы адказаў на іх пытанні, якія цікавяць сёння многіх жыхароў краіны.**

## Пытанне нумар адзін

Адказваючы на запыт пра стаўленне да экалогіі, Прэзідэнт адзначыў, што ён — вясковы чалавек, ды і цяпер жыве не ў горадзе, і экалогія — найважнейшае паняцце для яго асабіста. Усе дзяржавы сталі звяртаць увагу на гэтыя праблемы. І мы не можам быць у баку. «Я ўчора ўжо казаў швейцарскаму прадстаўніку (кіраўніку Федэральнага дэпартамента замежных спраў Швейцарскай Канфедэрацыі — *«Зв.»*) — нас называюць усходняй Швейцарыяй за тую прыгажосць, за чысціню, якая ёсць. І я падумаў, якія мы малайцы, што ў свой час узяліся за гэта, захоўваем чысціню на прадпрыемстве ў вас, у Светлагорску, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што сам не можа цярпець нядбайнасць. — У сельскай гаспадарцы, калі ў кароўнік нейкі зайду, і ўбачу беспарадак (я чыстаплюю па характары), мне зусім дрэнна становіцца».

Калі Прэзідэнту паведамілі пра непрыемны пах каля прадпрыемства ў Светлагорску, сітуацыя разбіралася дэталёва. ***«Экалогія — пытанне нумар адзін. Мы не павінны ў XXI стагоддзі ствараць вытворчасць, ад якой самі атруцімся і дзяцей нашых атруцім»,*** — сказаў кіраўнік краіны.

Ён назваў самыя важныя, на яго погляд, элементы для здароўя: паветра, харчаванне, вада, рух. Правільнае харчаванне, як адзначыў Прэзідэнт, гэта не заморскія фрукты і гародніна, а тое, што вырошчваецца ў нас. «Ясце бульбу, хлеб не ў вялікай колькасці, сала, мяса рознае, якое вы можаце купіць, — пералічыў Прэзідэнт. — Вось ад гэтага экалогія: харчаванне, ежа, паветра».

## Інтэграцыя — не інкарпарацыя

***Палітыка нашай дзяржавы будуецца на сумленнасці, і ў першую чаргу сумленнасці кіраўніцтва.*** Аляксандр Лукашэнка нагадаў нядаўнюю гісторыю з арыштам дырэктараў цукровых заводаў, якія ў ходзе следства расказалі пра свае карупцыйныя схемы. «Не чапай чужое, асабліва кіраўнік. ***Калі кіраўнік злодзей, прадпрыемства няма, працоўнага калектыву няма.*** Сотні і тысячы людзей, якія ў цябе працуюць, марнеюць», — канстатаваў лідар краіны.

Гэта адступленне папярэднічала пытанню аб змесце перагавораў у Сочы з Уладзімірам Пуціным, якія адбыліся тыдзень таму. Сустрэча пачалася з ужо вядомага снядання з кашай на вадзе. А якую кашу тады ўдалося «зварыць» лідарам, паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Невыпадкова ён ва ўступным слове ў Сочы адзначыў, што паўтарагадзінныя перамовы ў фармаце сам-насам пачаліся з успамінаў аб былых часах, у тым ліку і аб існаванні ў адзінай дзяржаве. У савецкія часы спецыялісты з усёй Беларусі дапамагалі бурыць нафтавыя, газавыя свідравіны ў Расіі, якія ў адно імгненне аказаліся чужымі.

Расіяне сарвалі тэрміны здачы БелАЭС, што пагражае вялікімі штрафамі з бюджэту Расіі. Прэзідэнт Пуцін прапанаваў дамовіцца без санкцый. Аляксандр Лукашэнка выступіў з такім варыянтам: «Давайце дамовімся, што працэнт па крэдыце (мы ж за іх грошы будуем, узялі ў іх крэдыт, працэнт высокі) скароцім да таго ўзроўню, як вы будуеце ў Венгрыі, у В'етнаме, дзесьці каля трох працэнтаў. Санкцыі мы не будзем уводзіць, і тое на тое выйдзе. І крэдыт, калі вы тэрміны сарвалі, мы пачнем выплачваць не праз два гады, а праз пяць». Пытанне яшчэ будуць разглядаць далей.

А вось умовы з «блакітным палівам» для Беларусі па 127 долараў за тысячу кубаметраў некалькі супярэчаць ідэі Саюзнай дзяржавы. Такі кошт ставіць айчынныя прадпрыемствы ў няроўныя канкурэнтныя ўмовы з расійскімі, якім газ паступае значна танней. ***«Я нічога лішняга не хачу, мы ў саюзе, і не толькі саюзе Беларусі і Расіі, але і ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Мы дамовіліся, што тут у нас будзе гандаль таварамі, паслугамі, і перамяшчэнне капіталаў.*** Асабліва тавары і паслугі без мытных пошлін, — сказаў лідар краіны. — ***А які ж саюз, калі няма роўных умоў для людзей, прадпрыемстваў?*** Што такое: у нас 200 долараў за, дапусцім, газ, электрычнасць, а ў такіх прадпрыемствах у Расіі 100 долараў ці 80 ? Як з імі канкурыраваць?»

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што пэўным колам, якія папракаюць яго ў нежаданні інтэгравацца, трэба не блытаць гэта паняцце з далучэннем. ***Інтэграцыя — гэта роўныя цэны, свабоднае перамяшчэнне тавараў, магчымасці для працоўнай міграцыі, аднолькавае налічэнне пенсій, навучанне для студэнтаў па квотах. «Яны разумеюць інтэграцыю — паглынаннем Беларусі Расіяй. Гэта не інтэграцыя — гэта інкарпарацыя. На гэта я ніколі не пайду»,*** — заявіў кіраўнік дзяржавы, чым выклікаў апладысменты слухачоў.

Размаўлялі і пра нафту: сусветныя цэны і неабгрунтаваныя прэміі расійскім кампаніям. Партнёры мяркуюць, што беларусы не будуць купляць «чорнае золата» за краем свету даражэй, чым прапануюць яны. Адказ Прэзідэнта: «Буду. Мне Пуцін задае пытанне: «А навошта ты даражэй будзеш купляць?» Я кажу: «Каб кожны год 31 снежня ў 12 гадзін ночы не стаяць перад табой на «каленях».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што так быць не павінна і не будзе. Прадаюць па сусветнай цане — купляем, перапрацоўваем, але прэміі плаціць не будзем. Нафта з Саудаўскай Аравіі, ЗША і іншых патэнцыйных партнёраў можа пайсці рэверсам праз Гданьск па той жа трубе «Дружба», па якой цяпер пастаўляецца расійская. Гэтым жа шляхам, па трубе, нафта з Прыбалтыкі можа транспартавацца на мадэрнізаваны Наваполацкі завод, які забяспечыць якасным палівам іншыя краіны гэтага рэгіёна.

## Падбіраць культуры і пароды

Па словах Прэзідэнта, ***Беларусь, калі хутка не прыстасуецца да змены кліматычных умоў, можа шмат страціць.*** Да пачатку пасяўной кампаніі ён даручыў старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзю Салаўю вызначыцца, што і дзе будуць сеяць.

У Беларусі даўно магчыма атрымліваць ураджай кавуноў. На ўласным вопыце гэта ведае кіраўнік краіны, які для душы вырошчвае новыя сарты рознай агародніны і садавіны. Будзе адраджацца на Беларусі і авечкагадоўля, утрыманне іншых парод жывёлы на мяса.

Гомельскай вобласці Прэзідэнт прапанаваў брацць апрабаваныя сельскагаспадарчыя культуры. «Я яму (Генадзю Салаўю — *«Зв.»*) сказаў, што гэты год будзе для яго вызначальны: ці мы падымаем Гомельшчыну на патрэбны ўзровень, ці мы будзем прымаць жорсткія меры ў сельскай гаспадарцы, як у Віцебскай вобласці», — дадаў ён.

Трэба падбіраць тыя культуры, якія з улікам клімату, што змяніўся, могуць тут вырошчвацца, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Бліжэй да людзей

# І ГРОШЫ — ВЯРНУЛІ!

**На прыём па асабістых пытаннях кіраўніка Камітэта дзяржкантролю Леаніда Анфімава, да якога звярнулася маці пяцярых дзяцей. Жыхарка Віцебска расказала пра адсутнасць камунікацый, неабходных для падключэння да катэджа, што будуе сям'я.**

Як паведаміла «Звяздзе» **Аксана РУДНІЦКАЯ, кіраўнік упраўлення экспертна-прававой работы і зваротаў грамадзян Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці,** вясной мінулага года Алена Сяргееўна Курс прыйшла на прыём грамадзян і паказала перапіску з рознымі інстанцыямі. Агучыла праблему адсутнасці падводкі інжынерных камунікацый да індывідуальнага жылля.

Між іншым, мясцовая ўлада абавязана ў выпадку будаўніцтва індывідуальнага жылля паклапаціцца, каб усе выгоды цывілізацыі былі падведзены да тэрыторыі планаванай забудовы.

Участак зямлі пад дзевяць сотак, дарэчы, заяўнікі купілі на аўкцыёне прыблізна за 10 тысяч долараў у эквіваленце, на ўскраіне горада ў мікрараёне Тарны.

Да гэтага шматдзетная сям'я атрымала бясплатна, згодна з заканадаўствам, «соткі» ў Арэхаве — былой вёсцы, дзе цяпер вядуць індывідуальнае будаўніцтва гараджане. Але хутка высветлілася, што месца няўдалае, бо зямля забалочаная. Іншы ўчастак, згодна з заканадаўствам, атрымаць бясплатна ўжо нельга, бо такая магчымасць гарантавана толькі адзін раз.

Леанід Анфімаў даручыў узяць зварот жанчыны на асаблівы кантроль. Па логіцы ж, дзяржава гарантуе прэферэнцыі і асаблівае стаўленне да шматдзетных. Неадноймы нагадваў пра гэта і кіраўнік дзяржавы, і іншыя адказныя асобы. А ў канкрэтным выпадку што? І з зямлёй напачатку не пашанцавала, і вялікія грошы патрачаны на набыццё новага ўчастка. Дык яшчэ і камунікацый няма.

З падачы Камітэта дзяржкантролю кіраўніцтва Віцебскага гарвыканкама звярнулася да Прэзідэнта.

— Хадайнічалі аб тым, каб з гарадскога бюджэту можна было вярнуць грошы, патрачаныя на набыццё зямельнага ўчастка на аўкцыёне. І кіраўнік дзяржавы, які мае права ў некаторых выпадках прымаць такія рашэнні (гэта прадугледжана Указам № 667, які ў народзе называюць «зямельным»), распарадзіўся, каб сям'і вярнулі грошы, — працягвае Аксана Рудніцкая.

Як расказала аўтару гэтых радкоў Алена Курс, пакуль сям'я жыве ў мікрараёне Медцэнтр у двухпакаёвай кватэры. Старэйшай дачцэ Ульяне шэсць гадоў, Івану — пяць, Данілу — чатыры, Кірылу — два, Сафіі — адзін год.

У канцы года да дома, які будуецца, падвялі і газ, і электрычнасць, і ваду.

— Канешне, я не спадзявалася, што так адрэагуюць на мой зварот. Асабіста хочацца падзякаваць Леаніду Анфімаву і цяпер ужо былому кіраўніку Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці Вадзіму Заранкіну, нядаўна прызначанаму мэрам Віцебска, — сказала жанчына.

Між іншым, пра вяртанне грошай спачатку і размовы не было. Атрымаўся «звычайны цуд». Сям'я Курс цяпер у курсе, што падтрымка многадзетных — насамрэч адзін з найважнейшых прыярытэтаў у сацыяльнай палітыцы дзяржавы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Кадры

# СЯРОД ДАКТАРОЎ НАВУК ЖАНЧЫНЫ Ў МЕНШАСЦІ

**У 2019 годзе Вышэйшая атэстацыйная камісія прысудзіла навуковую ступень 397 саіскальнікам: ступень доктара навук атрымалі 39 чалавек, а кандыдата навук — 358. Вучонае званне прафесара прысвоена 38 саіскальнікам, дацэнта — 351.**

Як расказаў журналістам **старшыня ВАК Аляксандр ГУЧОК,** па колькасці прысуджаных вучоных ступеняў пераважае медыцына. Летась гэта было 77 абароненых дысертацый (або 19,4 працэнта ад агульнай колькасці). У тэхнічных навуках была абаронена 61 работа, у фізіка-матэматычных — 44, філалагічных — 33 работы, эканамічных — 32.

Таксама навуковыя ступені былі прысуджаны 44 замежным грамадзянам з 10 краін: Кітая, В'етнама, Лівіі, Ірака, Ірана, Казахстана, Расіі, Нігерыі, Украіны і Туніса. Найбольшая колькасць замежнікаў, якія абараніліся ў Беларусі, былі грамадзянамі КНР (15 чалавек). І сем грамадзян Беларусі абаранілі свае навуковыя работы за мяжой (тры доктарскія і чатыры кандыдацкія).

Увогуле колькасць прысуджаных па выніках 2019 года вучоных ступеняў доктара і кандыдата навук зменшылася ў краіне на 26,4 працэнта ў параўнанні з 2018 годам.

Сярэдні ўзрост саіскальнікаў вучонай ступені кандыдата навук набліжаецца цяпер да 36 гадоў, доктара навук — да 51 года. Сярод дактароў навук 463 уладальнікі гэтай ступені маюць узрост ад 65 да 69 гадоў і 535 чалавек — ад 70 да 74 гадоў. Жанчын сярод дактароў навук толькі 560, мужчын — дзве тысячы. А сярод кандыдатаў навук (усяго іх налічваецца 14 340) прыкладна 7,5 тысячы мужчын і 7 тысяч жанчын.

— Працэнт зніжэння колькасці абароненых навуковых работ датычыцца галоўным чынам кандыдацкіх дысертацый, — патлумачыла **галоўны вучоны сакратар Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Вольга ДУБАНЕВІЧ.** — Мы аналізавалі дынаміку прысуджэння вучоных ступеняў, пачынаючы з 2008 года, і звярнулі ўвагу на тое, што колькасць абароненых доктарскіх дысертацый істотна не змяншаецца: яна вагаецца ад 40 да 50 работ у год. А вось зніжэнне колькасці абароненых кандыдацкіх мы прагназавалі, таму што на гэта ёсць аб'ектыўныя прычыны. Працэс атэстацыі шчыльна звязаны з працэсам падрыхтоўкі навуковых кадраў. І калі паглядзець статыстыку па колькасці прынятых у аспірантуру і колькасці выпушчаных з яе, то мы бачым там разрыў, які павялічваецца. Паказчык абароны кандыдацкіх дысертацый у год заканчэння аспірантуры застаецца невысокі (ён вагаецца ад 5 да 9 працэнтаў).

Калі сёння сярэдні ўзрост саіскальніка кандыдацкай ступені набліжаецца да 36 гадоў, то можна спрагназаваць, што па самым аптымістычным сцэнарыі навуковец выйдзе на абарону доктарскай работы цягам бліжэйшых 10-15 гадоў, таму ўзроставая структура дактароў навук па-ранейшаму будзе пасунута бліжэй да пенсійнага ўзросту.

Аляксандр Гучок праінфармаваў, што ў 2019 годзе ВАК не зацвердзіў 47 дысертацый (у 2018 годзе — 29).

З 47 дысертацый 14 работ (6 доктарскіх і 8 кандыдацкіх) былі адхілены Прэзідыумам ВАК. 33 дысертацыі (6 доктарскіх і 27 кандыдацкіх) былі зняты саіскальнікамі з разгляду ў ВАК для дапрацоўкі.

Па пяці доктарскіх і трох кандыдацкіх Прэзідыумам ВАК ствараліся камісіі для ўстанаўлення фактаў некарэктных запазычанняў і падлогу матэрыялаў, уключаных у дысертацыі. Па прадстаўленні згаданых камісій Прэзідыум ВАК зняў дзве доктарскія і дзве кандыдацкія дысертацыі з правам іх абароны не раней, чым праз пяць гадоў.

Дысертацыі адхіляліся ў сувязі з адсутнасцю навуковай навізны прадстаўленых вынікаў, а таксама спасылак на аўтара і крыніцу пры выкарыстанні матэрыялаў і вынікаў, якія належаць іншым даследчыкам.

На адмоўныя рашэнні, прынятыя Прэзідыумам ВАК і саветамі па абароне дысертацый, былі пададзены 12 апеляцый. Задаволена з іх толькі адна па доктарскай дысертацыі. У 2018 годзе такіх апеляцый было пададзена пяць, а задаволена з іх адна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На слыху

# Яшчэ адзін аздараўленчы цэнтр

## Падрыхтавалі для кітайскіх студэнтаў

**Для кітайскіх студэнтаў, якія вяртаюцца ў Мінск, рыхтуюць яшчэ адзін аздараўленчы комплекс — «Загор'е». Тыдзень таму іх пачалі размяшчаць у САК «Брыганціна» Белдзяржуніверсітэта. На сёння ў Мінск прыбылі 174 студэнты. Як паведамлялася раней, па звестках Міністэрства адукацыі, на канікулы ў Кітай паехала 920 студэнтаў, якія вучацца ў беларускіх навучальных установах. Большая іх частка (у нас атрымлівае адукацыю каля чатырох тысяч студэнтаў з КНР) у сувязі з успышкай каранавіруса ў Кітай не выязджала і не пакідала тэрыторыі Беларусі.**

Як паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН,** для забеспячэння бесперапыннага медыцынскага назірання за студэнтамі з КНР, якія працягваюць навучанне ў беларускіх універсітэтах, наладжана іх аздараўленне ў САК «Брыганціна» БДУ і Мінскім абласным цэнтры медыцынскай рэабілітацыі «Загор'е».

— Размова ідзе пра дадатковыя меры для студэнтаў, якія не былі ў кантакце з хворымі і не наведвалі эпідэмічна-неспрыяльныя раёны, а таксама для тых, да каго прымяняліся меры каранціну ў КНР. На сёння ўсе 174 студэнты, якія прыбылі, знаходзяцца пад медыцынскім назіраннем, — удакладніла Юлія Барадун.

Зараз у аздараўленчым комплексе «Загор'е» завяршаецца падрыхтоўчая работа да прыёму студэнтаў. Усе супрацоўнікі, якія будуць тут працаваць, прайшлі дадатковую падрыхтоўку. Для студэнтаў будзе арганізавана індывідуальная форма навучання. Такія ж меры эпідэмічнай бяспекі ўведзены ва ўсіх абласцях краіны, дзе вучацца студэнты з КНР.

— Беларускім грамадзянам на гэты перыяд прапануюцца паслугі двух іншых рэабілітацыйных цэнтраў — у вёсках Аксакаўшчына і Атоліна, — адзначыла Юлія Барадун.

Інфармацыю пра ўсіх асоб, якія прыбываюць з КНР, спецыялісты Міністэрства аховы здароўя атрымліваюць ад дзяржаўных пагранічнага і мытнага камітэтаў, Міністэрства транспарту і камунікацый, праводзіцца іх лабараторнае абследаванне і аператыўная дастаўка ў аздараўленчыя цэнтры. За перыяд з 28 студзеня да 14 лютага санітарна-каранцінным кантролем было ахоплена больш за 300 тысяч чалавек, якія перасеклі мяжу Беларусі.

У цяперашні час у Беларусі не зарэгістравана выпадкаў захворвання інфекцыяй, выкліканай каранавірусам COVID-19. Аднак з 30 студзеня ў рэжым павышанай гатоўнасці пераведзена работа ўсёй санітарна-эпідэміялагічнай службы, хуткай медыцынскай дапамогі, амбулаторна-паліклінічных і бальнічных арганізацый аховы здароўя. Яны гатовы да прыёму пацыентаў з падазрэннем на каранавірус і правядзення медыцынскага назірання за кантактнымі асобамі.

Дыягностычная лабараторыя РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, якая праводзіць даследаванні і тэсты, працуе ў кругласутачным рэжыме. Даследаваны матэрыял амаль тысячы чалавек. Ва ўсіх выпадках вынік праверкі на каранавірусную інфекцыю адмоўны.

Паводле звестак, якія прыводзіць Нацыянальная камісія па ахове здароўя Кітая, ад каранавіруснай інфекцыі ў краіне загінула 1380 чалавек. Заразіліся ёй больш за 63,8 тысячы, з якіх больш за 10 тысяч чалавек знаходзіцца ў цяжкім стане. Выздаравелі 6723 чалавекі. Агульная колькасць тых, хто захварэў ва ўсім свеце, складае 64 434 чалавекі.

У Сусветнай арганізацыі аховы здароўя не выключаюць, што, калі не спыніць эпідэмію, заразіцца можа 2/3 насельніцтва Зямлі. Пра гэта заявіў саветнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя вірусолаг Айра Ланджыні. Эксперт зыходзіць са звестак, што кожны заражаны вірусам перадае яго двум-тром чалавекам. У Кітаі колькасць новых выпадкаў штодзень можа складаць 50 тысяч. Замарудзіць распаўсюджванне захворвання можа толькі каранцін.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Лейбарысты запатрабавалі расследаваць адпачынак брытанскага прэм'ера на Карыбах



Лейбарысцкая партыя Вялікабрытаніі запатрабавала пачаць афіцыйнае расследаванне ў сувязі з сітуацыяй вакол адпачынку прэм'ера краіны Барыса Джонсана на Карыбскіх астравах коштам 15 тысяч фунтаў стэрлінгаў, паведамляюць брытанскія СМІ. Такая заява з'явілася пасля таго, як спонсар Кансерватыўнай партыі, мільярдэр Дэвід Рос і сам прэм'ер разышліся ў меркаванні па пытанні аб тым, хто менавіта аплаціў гэты вояж. Сам прэм'ер раней у дэкларацыі ў рэестры адзначыў, што Рос дазволіў яму і яго партнёрцы Кэры Саймандс скарыстацца вілай на востраве Мюсцік. Аднак, па дадзеных выдання Daily Mail, насамрэч Рос не з'яўляецца ўладальнікам гэтай вілы і не плаціў за адпачынак Джонсана.

### Тэмпература ў Антарктыдзе ўпершыню паднялася вышэй за плюс 20 °С

Бразільскія метэаролагі паведамілі, што на востраве Сімор каля паўночнага ўскрайку Антарктыды тэмпература паветра дасягнула 20,75 градуса Цэльсія. Такі высокі паказчык адзначаны ўпершыню ў гісторыі. Рэкорд, які трымаўся амаль 40 гадоў, пабіты. У студзені 1982-га года тэрмометр паказаў плюс 19,8 градуса. «Гэта сігнал аб тым, што ў гэтым раёне адбываецца нешта незвычайнае», — заявіў бразільскі метэаролаг Карлас Шэфер. На кантыненце Антарктыда на мінулым тыдні таксама адзначана рэкордна высокая тэмпература — яна паднялася да плюс 18,3 градуса. Мяркуецца, што лічбы гэтага года павінны быць яшчэ пацверджаны сіноптыкамі з Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі. Але і цяпер эксперты, зыходзячы з назіранняў, сцвярджаюць, што ў параўнанні з даіндустрыяльнай эпохай, тэмпературы ў Антарктыцы павысіліся на тры градусы. Яны дадаюць, што гэты феномен — следства змены клімату і падкрэсліваюць, што бягучая сітуацыя далёкая ад нармальнай.

### Бэнксі падарыў роднаму гораду валянцінку

У Брысталі напярэдадні 14 лютага на тарцы будынка ў раёне Бартан-Хіл з'явілася новая праца Бэнксі. Мастак апублікаваў яе фатаграфію ў сваім інстаграме. Ён такім чынам падцвярджае аўтарства некаторых са сваіх твораў. На валянцінцы дзяўчынка страляе з рагаткі, траплене ў нешта і яно выбухае букетам чырвоных кветак. Жыхары Бартан-Хіла ўбачылі гэтую працу раніцай 13 лютага. Увесь дзень сюды сцякаліся натоўпы цікаўных, і гаспадары кватэр гэтага дома ўжо занепакоіліся, якім чынам абараніць дадзены твор мастацтва, піша Guardian. Лічыцца, што Бэнксі нарадзіўся ў Брысталі ў 1974 годзе. Ён з 1990-х гадоў займаецца графіці і да гэтага часу захоўвае ананімнасць.

Парламенцкі дзённік

# Тым, хто выканаў свой абавязак

## Разглядаецца магчымасць замацавання квот на працоўныя месцы на прадпрыемствах для інвалідаў

**Пра гэта заявіла старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ на сустрэчы з ветэранамі-ўдзельнікамі баявых дзеянняў у сваёй выбарчай акрузе напярэдадні 31-й гадавіны вываду войскаў з Афганістана.**

«Сёння ёсць рэчы, якія больш каштоўныя, чым матэрыяльны дабрабыт, нейкія бытавыя пытанні. Дзяржава не толькі дае правы, але і патрабуе выкананне абавязкаў, — падкрэсліла дэпутат. — Вы — прыклад выканання абавязкаў. Я хачу, каб вы гэта ведалі, каб вы гэта чулі, каб вы разумелі, што дзяржава гэта цэніць».

Святлана Любецкая расказала, што разглядаецца пытанне пазбаўлення наймальнікаў магчымасці скасавання дагавора з працуючым інвалідам, які знаходзіцца на рэабілітацыі незалежна ад таго, колькі яна працягваецца. Пры скарачэнні штату інваліды ў першую чаргу павінны замацоўвацца на працоўных месцах. Абмяркоўваецца магчымасць, каб мясцовыя выканаўчыя органы ўлады прадугледжвалі квоту на прадпрыемствах для інвалідаў.

«Мы ўсе жывём у грамадстве. Такое можа здарыцца з кожным, таму гэтыя месцы павінны быць гарантаваны», — сказала парламентарый.

Па яе словах, на ўвазе дэпутацкага корпуса і пытанні медыцынскага забеспячэння ветэранаў, забеспячэння інвалідаў неабходнай інфраструктурай. З улікам сацыяльна-эканамічных магчымасцяў дзяржава прапрацоўвае сітуацыю з ільготамі, каб знайсці баланс інтарэсаў розных катэгорый грамадзян.

«У Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца праект закона аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі. Ён таксама датычыцца катэгорыі асоб, якія ў выніку пэўных падзей маюць праблемы са здароўем і маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне», — падкрэсліла старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.

На сустрэчы ў Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Цэнтральнага раёна Мінска таксама прысутнічаў кіраўнік адміністрацыі раёна Дзмітрый Пятруша, прадстаўнікі раённых службаў сферы ЖКГ, аховы здароўя, унутраных спраў, культуры, спорту. Ветэранаў прадстаўлялі члены Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць», Грамадскага аб'яднання «Асацыяцыя інвалідаў вайны ў Афганістане», Грамадскага аб'яднання «Памяць і абавязак», «Фонда сацыяльнай абароны ўдоў і дзяцей ваеннаслужачых, якія загінулі ў Афганістане і іншых лакальных канфліктах».

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ПАМЯЦЬ — ЖЫВАЯ

**Трыццаць адзін год таму апошнія савецкія падраздзяленні вярнуліся з Афганістана па мосце Хайратон ва Узбекістан. Неабвешчаная вайна цягнулася больш за дзевяць гадоў на проціледлым баку Амудар'і, дзе знаходзіўся абмежаваны кантынгент войскаў. Страціў ён больш за 15 тысяч чалавек загінулымі, сярод якіх 789 беларусаў. Яшчэ 55 тысяч былі паранены і больш за 400 зніклі без вестак.**



Памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў ушанавалі вучні 213-й сярэдняй школы Мінска. Напярэдадні 15 лютага яны выстраіліся жывым калідорам перад школьным музеем вайсковай славы, трымаючы ў руках свечкі... І тым самым далі старт акцыі «Памяць жывая».

У самім музеі вялікі стэнд прысвечаны не толькі падзеям Вялікай Айчыннай вайны, але і падзеям 1979—1989 гадоў у Афганістане. Цяпер фонды школьнага музея налічваюць больш за 1200 экспанатаў.

— Музей мы адкрылі 12 лютага мінулага года, — расказвае яго **кіраўнік Ганна КУЛІК.** — Мы атрымалі пэўныя фонды ў падарунак ад іншай школы. Цяпер мы працягваем папаўняць нашу калекцыю. Шчыруюць на гэтай ніве як вучні, так і іх бацькі. Мы знайшлі рарытэтныя дакументы — вызваленне ад ваеннай службы яшчэ царскіх часоў, нямецкія аўсвайсы, павесткі часоў Вялікай Айчыннай... А яшчэ ёсць савецкія каскі, сапраўдная форма, газеты ваенных гадоў. Маем мы і грамату ручной работы 1942 года, на якой намаляваны партрэт Сталіна, — ёй быў узнагароджаны лейтэнант. Каштоўны экспанат — біклажка-абеліск, якая выкарыстоўвалася замест надмагільнага помніка. Ну і некаторымі рэчамі з намі падзяліліся воіны-інтэрнацыяналісты. Дапамагалі нам таксама салдаты і афіцэры 56-га палка сувязі, арганізацыя ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць» — а менавіта **старшыня савета мінскай гарадской суполкі Уладзімір ШОКАЎ.**

На першым паверсе школы салдаты 5-й брыгады і 56-га палка сувязі разгарнулі экспазіцыю зброі. Туды выстраілася сапраўдная чарга з малых.

— За 56-м палком замацавана больш за паўсотні падшэфных навучальных устаноў — ліцэі, школы, дамы-інтэрнаты, — расказвае **выканаўца абавязкаў намесніка камандзіра 56-га палка сувязі па ідэалагічнай рабоце маёр Аляксандр БОЛВІНАЎ.** — І на працягу года амаль да ўсіх знамянальных дат — Дня настаўніка, Дня абароны дзяцей, 23 лютага, 9 мая — мы імкнёмся наведаць кожную такую ўстанову, правесці там урокі мужнасці. Не выключэнне і пярэдадзень 15 лютага. Увогуле сярэдняя школа № 213 узаемадзейнічае з многімі вайсковымі часцямі, структурамі МУС, з 5-й брыгадай спецыяльнага прызначэння. Прыязджаючы школьнікі і да нас на экскурсіі — не раз былі ў нас на Дні адчыненых дзвярэй. А 23 лютага будзем ставіць тэатральную пастаноўку, куды запрошаны і дзеці.

Пасля ўрачыстасцяў у музеі школьнікі разышліся па класах. Там у іх пачаліся ўрокі мужнасці. Вялі іх афіцэры, якія прайшлі праз Афганістан. Воіны расказвалі пра тое, што ім давялося перажыць у далёкай краіне.

— Я ў той час быў начальнікам палітаддзела 70-й асобнай гвардзейскай мотастралковай брыгады, — згадвае Уладзімір Шокаў. — Дыслакаваліся мы ў Кандагары. Гэта поўдзень Афганістана. Зона адказнасці — дзясяткі кіламетраў. Клімат зусім непрывычны — слупок тэрмометра сягаў далёка за 40 градусаў па Цэльсію. І пастаянныя абстрэлы... Думалі ж спачатку, што прабудзем там месяцы два, ну ад сілы тры. А ў выніку затрымаліся аж на дзевяць гадоў.

Цяпер у Мінску жыве крыху больш за чатыры тысячы воінаў-інтэрнацыяналістаў. Каля 200 чалавек з іх удзельнічалі ва ўзброеных канфліктах на тэрыторыі іншых дзяржаў, акрамя Афганістана. Сярэдні ўзрост іх досыць паважны — 56 гадоў. І за 31 год больш за 700 чалавек ужо з розных прычын пайшлі з жыцця. 15 лютага памяць усіх, хто не вярнуўся з тых войнаў, ушанаюць у Мінску на Востраве слёз.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27., тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

**Продавец:** ЗАО «Инвест-Систем» (УНП 100649060), 220040, г. Минск, ул. Л. Беды, д. 8, в лице ликвидатора ООО «АР Групп Сервис», тел. +37529 777-44-95.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **17 марта 2020 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Легковой седан КИА МАДЖЕНТИС, 2008 г. в., vin KNEGE222285249477, цвет серебристый металлик | 7680,00 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Фрунзе, 3, тел. для ознакомления +37529 698-53-53 | | |

**Для участия в торгах необходимо в срок с 16.02.2020 09.00 по 16.03.2020 г. 17.00:** 1. Зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY.** 2. Перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов.



## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 17.03.2020 повторного аукциона по продаже комплекса недвижимости

Лот № 1: **капитальное строение с инв. № 700/С-49731 – здание административно-бытового корпуса (РСЦ) подсобного хозяйства**, площадь – 622,7 кв. м, адрес: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75387 – здание КПП**, площадь – 13,0 кв. м, по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 47. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75386 – здание мастерской с компрессорной**, площадь – 172,0 кв. м, г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. **Капитальное строение с инв. № 700/С-49604 – здание столярного цеха**, площадь – 1455,0 кв. м, г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. Вышеуказанные капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000005002618 (площадь 1,8398 га, право постоянного пользования). **Капитальное строение с инв. № 700/С-49719 – овощная база**, площадь – 1324,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005001828 (площадь 221,7270 га, право постоянного пользования) по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. **Капитальное строение с инв. № 700/С-105889 – асфальтобетонное покрытие,** площадь – 1996,5 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005001828 (площадь 221,7270 га, право постоянного пользования) по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, территория ОАО «Могилевхимволокно». **Тепловые сети** от магистрали к зданиям АБК(РСЦ) подсобного хозяйства, столярного цеха и КПП (сельхозцех), инв. № 3010120400. **Канализационная сеть** от магистрали I очередь к зданиям АБК(РСЦ) подсобного хозяйства, столярного цеха и КПП (схц), инв. № 3010120600. **Счетчик жидкости и количества теплоты** СНТ2 ДУ32, инв. № 4701451600. **Забор металлический**, инв. № 2030069500. **Начальная цена продажи: 699 610,02 бел. руб. с учетом НДС.** Сумма задатка – 69 961,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 17 марта 2020 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений – по 16.03.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Могилевхимволокно», УНП 700117487, Могилевская обл., г. Могилев-35, 8-0222-499-047

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 0,5 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 20 (двадцать) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 11.06.2019

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**



## Изменения в проектную декларацию ООО «ДАТЧ СТАР»,

опубликованной в газете «Звязда» 14.12.2017 г.

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1–3)» (I очередь строительства, 7-й пусковой комплекс, 8-й пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**1 (одна) однокомнатная** квартира по принципу «свободной планировки» площадью 48,98 кв. м: стоимость 1 кв. метра от 1180 до 1250 долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, дом 19, офис 860. Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000

УНП 191061436



В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 25.01.2020 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **03.03.2020** в 11.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **28.02.2020** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by |

Асоба


Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**На рахунку рэжысёра і мастацкага кіраўніка Купалаўскага тэатра Мікалая Пінігіна больш за семдзесят спектакляў, і па некаторыя з іх хоць зараз ідзі на вуліцу Энгельса. Хоць, канешне, набыць білет будзе не так проста: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, які іграе свой соты сезон, з'яўляецца сёння адным з самых папулярных тэатраў краіны і залу на свае пастаноўкі запаўняе ўмомант. Не так даўно на гэтай сцэне прадставілі абяцаную спадаром Пінігіным прэм'еру «Караля Ліра», пра якую ўсё яшчэ гамоняць у культурным асяродку. Наперадзе выкананне іншых абяцанняў — публіка чакае пастаноўку шматпакутнай п'есы Янкі Купалы «Тутэйшыя», якая трыццаць гадоў таму, пасля доўгай забароны ўвасобленая Мікалаем Пінігіным у Купалаўскім, у пэўным сэнсе сімвалізавала пачатак новай эпохі. У час, калі тэатр не грыміць прэм'ерамі, а рыхтуецца да будучых, мы сустрэліся з рэжысёрам і пагутарылі пра сучасныя праблемы на сцэне тэатра, беларускую мову і, канешне, «Тутэйшых».**

## Мікалай ПІНІГІН:

# «КАБ ВЕДАЎ ЯК, САМ НАПІСАЎ БЫ КЛАСНУЮ СУЧАСНУЮ П'ЕСУ»

***— Спадар Мікалай, паводле вашых слоў, «тэатр павінен разбірацца ў нацыянальных праблемах». Ці ставіць сучасны беларускі тэатр перад сабой такую задачу?***

— Свядомасць рэжысёра ці мастацкага кіраўніка падказвае, што рабіць. У мяне асабіста і ў Купалаўскага тэатра, прычым з часоў яго стварэння, такая задача ёсць. Міністэрства культуры рэкамендавала нам трыццаць адсоткаў рэпертуара ставіць па беларускай літаратуры, але гэта нічога не вырашае: людзі і без таго ведаюць, куды ідуць, — кожны вечар на нашай сцэне гучыць беларуская мова, і Купалаўскі ў гэтым сэнсе такі амаль адзіны.

**«У Купалаўскага 98 працэнтаў запаўняльнасці залы — у гэтым сэнсе мы найлепшыя, а значыць, цікавыя беларусам».**

***— У рэпертуары Купалаўскага сапраўды не такі вялікі працэнт менавіта сучаснай беларускай драматургіі — як пры гэтым падымаць актуальныя праблемы?***

— Беларускія драматургі не пішуць па-беларуску, большасць з іх цікавіць расійскі рынак. Я чытаю амаль усё, што яны ствараюць, але якасць п'есы для мяне важнейшая за тое, хто яе аўтар па пашпарце. Тым не менш на нашай Камернай сцэне ідуць выдатныя спектаклі Рамана Падаляскі «Радзіва «Прудок» па кнізе Андруся Горвата і «Першы» ў жанры вербацім, дзе дарослыя ўспамінаюць дзяцінства. Па п'есе Паўла Пражко пастаўлены цудоўны «Ураджай»: вельмі сучасная работа, дзе персанажы гуляюць, як збіраць яблыкі. Я ж перастаўлю усю беларускую класіку, якая толькі ёсць, і, думаю, яна можа адказаць на сучасныя запыты. «Дзве душы» Максіма Гарэцкага: у беларуса дзве існасці — заходняя і ўсходняя, як з гэтым быць. «Пан Тадэвуш» Міцкевіча: твор пачынаецца з радкоў «Litwo! Ojczyzno moja!», закранае Вільнюс, Мінск і Вілейку і нагадвае, што мы — ліцвіны.

***— А як з нашым парадкам дня звязаны «Кароль Лір»?***

— Па-першае, вартасць мае цудоўны пераклад Юркі Гаўрука, які ў 1960-х адказваў у нашым тэатры за літаратурную частку, пры Сталіне адседзеў восем гадоў, а ўрэшце праз забарону вяртацца пераязджаў з месца на месца на расійскай поўначы. Ён выратаваўся тым, што ў 1930-х яго асудзілі раней, чым астатніх, інакш разам з іншымі расстралялі б. Як былі б расстраляныя Колас і Купала, калі б Сталін не сказаў Панамарэнку: «Слухай, ну пакінь каго-небудзь, дай ордэны, дачы, шафёраў, хтосьці павінен застацца».

А потым — сутнасць чалавека не мяняецца стагоддзямі, да таго ж у беларусаў з іншымі народамі заўсёды знойдуцца агульныя праблемы. Геніяльны літоўскі рэжысёр Эймунтас Някрошус толькі аднойчы паставіў спектакль па літоўскай п'есе, усё астатняе — па класіцы, і ў свой час ён быў брэндам нацыі. (Там усё нармальна з самасвядомасцю, гэта ў нас — праблемы.) «Рэвізор» ідзе на трасянцы, а хіба гэта не праблема краіны?

***— Сама па сабе трасянка?***

— Сама па сабе. Вы думаеце, мы на трасянцы паставілі ад добрага жыцця? Гэта галоўная праблема Беларусі. У мяне толькі Хлестакоў размаўляе на літаратурнай мове, таму што прыехаў са сталіцы, а ў раёне сваёй мовай пагарджаюць: «пачаму», «патаму» і «ашчушчэніе маментнасці». У гэтым адказ на многія надзённыя пытанні.

Мы не ставім нічога такога, што не звязана з сучаснасцю. У Купалаўскага 98 працэнтаў запаўняльнасці залы — у гэтым сэнсе мы найлепшыя, а значыць, цікавыя беларусам. Я вельмі хацеў бы, каб з'явілася класная сучасная п'еса, калі б ведаў як, сам бы яе і напісаў. У цэлым для развіцця нашай драматургіі трэба, каб беларуская мова вывучалася з дзіцячага садка, каб яна стала мовай вуліцы, каб усе зразумелі яе каштоўнасць. Тады з'явіцца рынак.

***— І пра што б вы напісалі сваю п'есу? На якія запыты часу, на ваш погляд, тэатр яшчэ павінен адказаць?***

— Шэкспір казаў, што тэатр павінен трымаць люстэрка перад прыродай. А я дадаў бы — перад грамадствам і Айчынай: мне цікава зразумець народную душу. Трэба казаць пра тое, чым мы адрозніваемся ад суседзяў, таму, напрыклад, у мяне ў «Тутэйшых» галоўны герой — не свядомы беларус Янка Здольнік, а Мікіта Зносак. Беларусы, каб выжыць, мусілі хавацца ў бульбу: калі на тэрыторыі пануе шведская, нямецкая ці руская армія, хіба можна ёй супрацьстаяць? «Ты хто?» — «Тутэйшы», — праблем няма, а калі не да месца назавешся рускім ці палякам — куля. Гэта адначасова і абраза для нацыі, і спосаб выжывання. Канешне, былі і героі — усе памятаюць толькі тры польска-літоўскія паўстанні — Касцюшкі, 1830-га і 1863 года, а іх было дваццаць чатыры, і ўсё гэта рабілі ў тым ліку мы. Але ў цэлым беларусы таму і выжылі, што ўхіляліся ад навалы. Калі я вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, нас адправілі ў Глыбоцкі раён на бульбу. Мы пайшлі на возера, а там сядзіць дзядок, пасе кароў. Мы пытаемся: «Дзед, ці ёсць у возеры рыба?» — «А куды яна падзенецца?» Мы прасядзелі цэлы дзень — ніводнай паклёўкі. Вяртаемся: «Дзед, ты ж казаў, тут рыба ёсць». — «А адкуль жа ёй узяцца?» Вось ключ да беларускай душы: ён не канфліктаваў, урэшце сказаў: ну, відаць, няма — і што мы з ім зробім? Развярнуліся і пайшлі.

Хвалюе мяне і праблема беларускай мовы. Перад Другой сусветнай вайной, як расказвала сяброўка маёй маці, тут былі адны беларускія школы, у вёсках размаўлялі, зразумела, па-беларуску, а ў Мінску 67 працэнтаў насельніцтва складалі яўрэі. Колас і Купала маглі звяртацца толькі да вясковаўцаў, чаму яны стварылі не шляхетны праект, а вясковы. Ён павінен скончыцца, лапці сваё адпрацавалі, прыйшоў час для праекта ВКЛ і Рэчы Паспалітай. У нас вялікая — праўда, знішчаная імперыяй — гісторыя, а быць лапцюжнікам нікому не хочацца.

***— То-бок, па вялікім рахунку, сённяшні тэатр мусіць раскрыць беларускую сутнасць.***

— Канешне! Чаму «Паўлінка» ідзе ў нас 76 гадоў і зала заўсёды поўная — у ёй ёсць душа народа. У савецкія ж часы з афішы прыбралі жанр спектакля — там было напісана «шляхоцкая гісторыя». Гэта п'еса пра шляхту: у бацькі Паўлінкі тры з паловай валокі, то-бок амаль 70 гектараў зямлі. Да таго ж яны ўніяты ці каталікі, гвалтам пераведзеныя ў праваслаўе: «Як паставяць гэты спранжыновы касцёл, то можна будзе спадзявацца і для нашага брата якога-такога палягчэння». Карацей, уся наша гісторыя, свядомасць, ідэнтычнасць і як яны фарміраваліся, нашы героі, ворагі, здраднікі — усё павінна цікавіць тэатр, і тады складзецца вобраз Беларусі.

***— У спектаклі «Талерантнасць» па п'есе Ясміны Рэзы вы дадалі сваю канцоўку з даволі празрыстым пасылам, маўляў, праз еўрапейскую талерантнасць ісламзапаўняе Еўропу. Вы праўда думаеце, што для Беларусі гэта актуальна?***

— Для Беларусі гэта не так актуальна, як для Заходняй Еўропы, але і нас гэта, можа быць, чакае... Я іранізую з талерантнасці, яна дапамагае бясконцаму навязванню чужых каштоўнасцяў тваёй цывілізацыі. У талерантнасці павінна быць мера. Я люблю Парыж, але сёння на яго вуліцах немагчыма знаходзіцца, ёсць цэлыя раёны, куды не ходзяць самі французы, некаторыя з'язджаюць у іншыя гарады, калі маюць магчымасць працаваць дыстанцыйна. Ужо дайграліся, еўрапейская цывілізацыя стаіць пад пагрозай знішчэння, і я не разумею, чаму кіраўнікі заходнееўрапейскіх краін так сябе паводзяць — пакуль іх рэжуць, кажучы: «Заходзьце, калі ласка».

***— А беларусаў вы сапраўды лічыце талерантнымі?***

— Беларусы талерантныя, таму што яны фарміраваліся менавіта ў дзяржаве, прычым самай магутнай у Еўропе, — законы ВКЛ сёння вывучаюць у еўрапейскіх універсітэтах. У Вітаўта быў вельмі просты парадак — плаці падаткі і жыві як хочаш, стаў хедары, сінагогі ці мячэці. І ён бачыў вынікі, бо дзяржава багацела. Яўрэі называлі Вітаўта літоўскім Кірам па аналогіі з імператарам, які падарыў ім вялікія свабоды. Да вайны, напрыклад, у нас шмат хто дадаткова ведаў ідыш. Тут ніколі не будзе нейкай ваяўнічасці, бо заўсёды было шмат нацыянальнасцяў, моў і рэлігій.

**«Я дзіка не хацеў зноў ставіць «Тутэйшых», мяне амаль што прымусілі гледачы і сябры».**

***— Калі гаварыць пра беларускую душу, савецкая спадчына, на ваш погляд, — гэта нешта вонкавае ці ўжо яе частка?***

— Цяпер ужо частка, але паслухайце — яўрэі сабраліся ў Ізраілі і нават аднавілі мёртвую мову іўрыт. Безумоўна, савок — гэта жудасная рэч. Тры з паловай тысячы населеных пунктаў на тэрыторыі Беларусі былі перайменаваныя на першамайскія, ленінскія і гэтак далей. Я ў свой час ставіў ірландскага драматурга Браяна Фрыла — наш лёс вельмі падобны да ірландскага, — які напісаў геніяльную п'есу пра тое, як англічане мяняюць ірландскія назвы на англійскія, а тыя пачынаюць паўстанне, бо ў гэтых назвах таксама душа народа. «Рэвізор» — гэта ж у тым ліку савецкая гісторыя. У 1960-х сюды прыехаў Хрушчоў і сказаў, што чым хутчэй Беларусь пяройдзе на рускую мову, тым хутчэй пабудуе камунізм. Былы міністр культуры Расіі Уладзімір Мядзінскі неяк выказаўся: «Што гэта тут у вас беларускія шыльды сталі з'яўляцца?» Міністр культуры кажа суверэннай краіне. Так здарылася, што Беларусь не мела сваёй эліты, бо яе пазабівалі на ўсякіх паўстаннях, Віленскі ўніверсітэт быў закрыты па загадзе Мікалая І, потым прыйшлі рэпрэсіі — і з краіны зрабілі краіначку. Давайце хоць бы размаўляць пра гэта. Але працэс ідзе — ці маглі мы ўявіць, што размаўляць на беларускай мове стане модна? Спакваля ўсё вяртаецца, трэба толькі не перашкаджаць працэсу, а дапамагаць, бо мова і культура ў цэлым — гэта нацыянальная бяспека.

***— А наколькі, як вам здаецца, сёння магчыма падтрымліваць культуру?***

— Усё вельмі проста: павінна быць воля ўлад. У ЗША, між іншым, няма міністэрства культуры, але ёсць закон, згодна з якім тыя, хто падтрымлівае культуру, плацяць меншыя падаткі. Больш за тое, у грамадстве яны становяцца паважанымі персонамі — гэта ў нас культура разумеецца як нешта, што можа быць, а можа не быць, і мецэнаты ведаюць, што іх дапамога ніяк не будзе ацэнена. Калі ўваходу ў Метраполітан-опера ў Нью-Ёрку вісіць вялізны банер, на якім паказваецца, што, умоўна, Ракфелер на спектакль даў столькі, гэты — столькі, а ўнізе — «Вучань сёмага класа Джо даў дзесяць долараў». Разумееце, падтрымліваючы культуру, яны ствараюць дзяржаву, а значыць, насельніцтва не валіць з краіны, а працуе дзеля яе. Мой сябар з Эстоніі кажа, што ў іх кандыдат у прэзідэнты, які не агаворвае, колькі працэнтаў бюджэту ён мяркуе выдзеліць на культуру, не мае шанцаў быць абраным. Маленькая нацыя павінна ўсведамляць, што праз культуру яна жывая. Але ў Брэхта было: «Спачатку хлеб, а маральнасць потым». У гэтым ёсць праўда: спачатку дабрабыт, а потым тэатр.

***— У Купалаўскім плануецца чарговая пастаноўка «Тутэйшых». З вашай першай яе пастаноўкі прайшло трыццаць гадоў — ці памянялася за гэты час нешта ў самаўсведамленні беларусаў і ці застаецца Зносак нашым дакладным партрэтам?***

— Спектакль упершыню паставілі ў 1926 годзе і адразу знялі — пэўны час Купала ўвогуле не заходзіў у наш тэатр, ён яшчэ не ведаў, што пачынаюцца чысткі, турмы і расстрэлы. На жаль, п'еса актуальная і будзе актуальная яшчэ вельмі доўга, да сусветнага патопу. Бо Беларусь знаходзіцца паміж двума культурнымі полюсамі — візантыйскім і лацінскім, з рознымі рэлігіямі, этыкай і сістэмай паводзін. Таму Мікіта Зносак выжывае, а што яму рабіць?

***— То-бок гэта станоўчы персанаж?***

— Не, вядома ж, але я разумею гэтага чалавека. У п'есе «Жыццё Галілея» Брэхта ёсць геніяльная рэч: "Няшчасная тая краіна, у якой няма герояў" — "Не! Няшчасная тая краіна, якая мае патрэбу ў героях". Я дзіка не хацеў зноў ставіць «Тутэйшых», мяне амаль што прымусілі гледачы і сябры. Я паставіў гэты спектакль, калі незалежнай Беларусі яшчэ не было, на будынку ЦК насупраць тэатра яшчэ вісеў савецкі сцяг, але мы чакалі, што нешта мусіць змяніцца. Такое ў лёсе рэжысёра здараецца толькі аднойчы, гэта быў не поспех, а штосьці іншае, каб гэта паўтарыць, трэба вярнуцца ў тыя часы: большасць беларусаў не ведала, што такое незалежнасць і навошта яна, і раптам выходзіць забароненая п'еса Купалы. Спектакль ішоў шаснаццаць гадоў, потым яго закрылі, усё ж забараніць п'есу Купалы ў Купалаўскім — гэта моцная гісторыя. Ну што зрабіць. А потым я зразумеў: за трыццаць гадоў вырасла некалькі пакаленняў людзей, якія ніколі не чыталі «Тутэйшых», а ў тэатр, можа, і прыйдуць. І я прымусіў сябе.

***— Што адбывалася пасля той прэм'еры? Ці можна апісаць поспех «Тутэйшых» у пачатку 1990-х?***

— Гэта немагчыма. Ніл Гілевіч абдымаў мяне і казаў: «Хлопча, ты сам не разумееш, што стварыў». Не таму што я добры, а таму што творцам закрывалі раты, і раптам на сцэне першага тэатра з'яўляецца гэты спектакль. 90-я ніколі не паўтарыць, для мяне гэта былі найлепшыя гады. Я ведаю, што новых «Тутэйшых» будуць параўноўваць з тымі, і не на карысць новых, але я да гэтага гатовы.

***— Вы расказвалі, што ў пэўны момант адчулі сябе беларусам. А што значыць быць беларусам?***

— Я адчуў сябе беларусам падчас работы ў Санкт-Пецярбургу — гэта самы еўрапейскі расійскі горад, і ўсё роўна розніца ў менталітэтах для мяне стала відавочная. Калі я працаваў акцёрам у Рускім тэатры, да мяне прыехаў сябар з Чэлябінска. Ён мне кажа: «Слухай, я вашых людзей не разумею». — Я пытаюся: «А што такое?» — «Еду ў грамадскім транспарце, і ўсе маўчаць». — «А што павінна быць?» — «У нас едзеш: тут цябе паслалі, там некаму далі ў морду». Беларускасць — гэта далікатнасць і паэтычнасць, праўда, савок паўплываў на гэты народ, разбурыў рэлігію, пакінуў вёскі без царкваў. Раней казалі: «Перад людзьмі будзе сорамна», — а цяпер нікому ні перад кім не сорамна...

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

Юбілей

# «Малевіч ведаў, што ён геній»

## Канферэнцыя даследчыкаў да стагоддзя УНОВИСа прайшла ў Віцебску

**Яны стварылі ва ўсіх сэнсах рэвалюцыйную плынь мастацтва і нават праз сто гадоў выглядаюць наватарамі: учора, 14 лютага, святкаваўся юбілей УНОВИС — аб'яднання творцаў у Віцебскім народным мастацкім вучылішчы пад кіраўніцтвам Казіміра Малевіча. Менавіта ў гэты дзень сто гадоў таму група прыняла сваю канчатковую назву — Сцвярджальнікі новага мастацтва, і ўжо хутка ў віцебскай газеце апублікавала свой маніфест. Сёння гэтыя плынь, філасофія, нарэшце, феномен і тое, што пайшло за дзейнасцю Віцебскага УНОВИСа, а праіснаваў ён крыху больш за два гады, вывучаюць па ўсім свеце. Таму натуральна, што менавіта ў Віцебску — горадзе, дзе ўсё пачыналася, і менавіта ў будынку, па прыступках якога хадзілі Марк Шагал, Казімір Малевіч, Лазар Лісіцкі, Вера Ермалаева, Лазар Хідэкель ды іншыя, — з 12 да 14 лютага прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная стагоддзю сцвярджальнікаў.**

Канферэнцыя стала адным з шэрагу мерапрыемстваў у рамках святкавання стагоддзя УНОВИС. Усяму папярэднічала ўручэнне Міжнароднай прэміі імя Лазара Хідэкеля — архітэктара, аднаго з заснавальнікаў аб'яднання і вучня Казіміра Малевіча. Потым у Мінску глядзелі дакументальны фільм «УНОВИС» Яўгена Сяцько, у Віцебску адкрывалі выставу сябра аб'яднання Давіда Якерсона, а ўчора ў Нацыянальным мастацкім музеі прадстаўлялі экспазіцыю «Нас зразумеюць праз сто гадоў. Лазар Хідэкель», якую прывезла сюды сям'я архітэктара з Нью-Ёрка.

Пералік выглядае багата, хоць усё роўна хочацца сказаць, што гэтага недастаткова: значэнне падзей 1920-х гадоў у Віцебску і самога Віцебска для сусветнага мастацтва, а ў тым ліку і для нашай краіны, складана пераацаніць. Як у «Звяздзе» ўжо згадвалася, варта было б нават аб'явіць 2020-ы годам УНОВИСа, хоць неафіцыйна ён такім і з'яўляецца.

Канферэнцыя, відаць, — самая грунтоўная падзея серыі і так дарэчы, што месцам яе правядзення стаў не проста Віцебск, але і сам будынак, дзе Марк Шагал некалі заснаваў мастацкую вучэльню, — сёння гэта мадэрновы Музей Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, адкрыты толькі ў 2018 годзе.

«Малевіч зрабіў дзве рэвалюцыі: першая з іх — «Чорны квадрат», а другая — УНОВИС», — лічыць траюрадная пляменніца мастака, якая, прыехаўшы на канферэнцыю з Дзюсельдорфа, аказалася ў Віцебску ўпершыню. Івона Малевіч, з чорным квадратам на пярсцёнку і малевічавых «фігурах» на шаўковай хустцы, — мастачка (альбо, як сама яна кажа, «маленькая мастачка») і віцэ-прэзідэнт Цэнтра памяці Казіміра Малевіча.

«Шмат з таго, што сёння ў мастацтве актуальна, пачыналася ў Віцебску. У сучаснай архітэктуры Даніэля Лібескінда і Франка Геры, напрыклад, можна ўбачыць уплыў Малевіча. Заха Хадзід натхнялася Малевічам, лічыла яго сваім гуру і казала, што ў яго навучылася ўсяму. Касмічныя станцыі зноў жа адсылаюць да Малевіча. Дызайн адзення быў распачаты сябрамі УНОВИСа. Лазар Лісіцкі яшчэ ў 1920 годзе зрабіў праект дома на вадзе, а сёння яны будуюцца, напрыклад, у Галандыі. Праграма сцвярджальнікаў уключала мастацтва ў жыццё, толькі мала хто пра гэта ведае. Для мяне важна, каб з УНОВИСам былі больш знаёмыя ў Беларусі, каб іх ідэі распаўсюджваліся ў Заходняй Еўропе і ў ЗША, каб людзі ведалі, дзе пачыналася шмат з таго, што мы бачылі ў XX стагоддзі і бачым у XXI-м».

У 1919 годзе Казімір Малевіч прыехаў у Віцебск, каб выкладаць у мастацкай вучэльні, аб'яднаў вакол сябе каля сарака вучняў і настаўнікаў і заняўся канцэпцыяй «партыі супрэматызму», вынікі чаго сёння можна прасачыць дзе заўгодна, адпаведна і прадметам даследавання УНОВИС становіцца па ўсім свеце.



У навукова-практычнай канферэнцыі прынялі ўдзел нашчадкі сцвярджальнікаў — апроч спадарыні Івоны траюрадны пляменнік Малевіча Станіслаў Багданаў з Масквы і праўнучка Эля Лісіцкага Валерыя, а таксама даследчыкі, мастацтвазнаўцы і прадстаўнікі музеяў з Беларусі, Расіі, Польшчы і Галандыі. У рэшце рэшт, у аб'яднання УНОВИС былі філіялы ў шматлікіх гарадах, а самі ўнавісаўцы раз'ехаліся з Віцебска, таму іх паслядоўнікі і творы знаходзяцца ў розных кутках свету.

Адным з добра знаёмых калег Казіміра Малевіча з'яўляецца вядомы мастак Уладзіслаў Стшэмінські — мінчанін, які пасля Першай сусветнай вайны пачаў свае тэарэтычныя і педагагічныя распрацоўкі ў Смаленску, дзе арганізаваў філіял УНОВИСа, а працягнуў іх у Польшчы, дзе ўвайшоў у так званую a.r. group, што можна патлумачыць як «рэвалюцыйныя мастакі» альбо «сапраўдны авангард». Пра ўплыў ідэй Малевіча на мастацтва Польшчы, што ў першую чаргу праяўляецца менавіта ў дзейнасці Стшэмінскага, расказвалі Даніэль Музычук і Паўліна Курц-Май з Музея мастацтва ў Лодзі.

«У Смаленску Стшэмінські пераймаў спосаб працы УНОВИСа, хоць у нас мала звестак пра дзейнасць мастака ў гэтым горадзе — ужо ў 1922 годзе ён знаходзіцца ў Польшчы. Першы тэкст, які Стшэмінські напісаў на польскай мове, быў прысвечаны рускаму мастацтву, аздабляўся выявамі работ Малевіча і пачынаўся з просьбы да польскіх улад прывезці мастака ў Польшчу. Мастак аддае супрэматызму першае месца ў значэнні для будучага развіцця мастацтва. Праз пяць гадоў Малевіч сапраўды прыехаў у Польшчу і зрабіў там выставу, існуе нават фотаздымак, дзе ён акружаны паэтамі і мастакамі», — расказаў Даніэль Музычук.

Уілем Ян Рэндэрс займаецца рускім мастацтвам у Музеі Ван Аббе ў галандскім Эйндховене, дзе, напрыклад, захоўваецца калекцыя твораў Эля Лісіцкага, у прыватнасці віцебскага перыяду. З пазітыўным заклікам не толькі глядзець на мастацтва, але і карыстацца ім, спадар Уілем лічыць, што ідэі ўнавісаўцаў, тым больш, што яны не абцяжараныя аўтарскімі правамі, трэба задзейнічаць у мастацтве, грамадстве і ўвогуле жыцці.

На канферэнцыі ён расказаў пра некалькі міжнародных праектаў, якія адлюстроўваюць падзеі 1919—1922 гадоў у Віцебску, у прыватнасці пра выставу «Шагал, Лісіцкі, Малевіч» у Нацыянальным цэнтры мастацтва і культуры Жоржа Пампіду ў Парыжы ў 2018 годзе. «Можна толькі ўявіць той цуд, які адбыўся ў Віцебску, калі Малевіч і Лісіцкі ўзначалілі па сутнасці рэвалюцыйную арганізацыю, што да таго ж змагла ўвасобіць некалькі прапагандысцкіх праектаў. Лісіцкага ў Віцебск запрасіў Марк Шагал: той пераехаў сюды з Кіева ў 1919 годзе, і хутка разам з Малевічам стаў рыхтавацца да заснавання УНОВИСа. Малевіч тады мала займаўся жывапісам — ён больш пісаў тэксты, якія Лісіцкі і іншыя вучні потым надрукуюць, але тым не менш аснову выставы склалі ў тым ліку яго творы».

Даследчык рускага мастацтва кажа, што цікавасць да УНОВИСа распаўсюдзілася яшчэ ў пачатку 1920 года, нават да Першай усерасійскай канферэнцыі тых, хто вучыць і вучыцца, у Маскве, на якую група, дарэчы, спазнілася на два дні.

Навуковая частка, вядома, склала аснову канферэнцыі: у першы дзень госці праслухалі серыю дакладаў, у тым ліку нашчадкаў унавісаўцаў, а на другі пераходзілі ад секцыі да секцыі, што атрымалі месца ў розных залах Музея. Канферэнцыя, бачна, выклікала цікавасць у тым ліку з боку студэнтаў, напрыклад яе асобнае мерапрыемства — лекцыя мастака і тэарэтыка мастацтва Дзмітрыя Гутава з Масквы, які ўзяўся адказаць на, здаецца, вечнае пытанне, што ў «Чорным квадраце» Малевіча такога асаблівага, і для гэтага зрабіў экскурс у гісторыю культуры.

На другі дзень канферэнцыі, ужо пасля навуковай часткі, гасцей занялі ўжо згаданы фільм Яўгена Сяцько «УНОВИС», футурыстычны праект «Перамога над сонцам», выстава, перформанс, неБалет, музыкальны батл і іншае, а ўчора, менавіта ў дзень стагоддзя сцвярджальнікаў, адбылося гашэнне мастацкага маркіраванага канверта, прысвечанага юбілею УНОВИСа.

Гісторыя аб'яднання і яго ўплыву ў Беларусі поўная кур'ёзаў. І сёння нельга сказаць, ці здолела беларускае мастацтва пайсці далей за ўнавісаўцаў, якія сто гадоў таму ў пэўным сэнсе зрабілі Віцебск цэнтрам сусветнага авангарда. На доўгія дзесяцігоддзі пасля таго, як Малевіч, УНОВИС, супрэматызм былі выцесненыя з парадку дня, іх ідэі і філасофія аказаліся забытымі. Толькі ў 1992 годзе Малевіч вярнуўся ў навучальную праграму Акадэміі мастацтваў. Яе рэктар Міхаіл Баразна, які мае да гэтага непасрэднае дачыненне, лічыць, што падзеі 1920—1922 гадоў адбыліся ў Віцебску не толькі па волі выпадку, але і таму, што гэты горад быў дастаткова талерантны, каб успрыняць рэвалюцыйнае мастацтва.

Каб выправіць знікненне УНОВИСа з беларускай прасторы, напэўна, трэба ісці за думкай, якая лейтматывам гучала на працягу ўсёй віцебскай канферэнцыі, — варта не толькі глядзець на мастацтва ўнавісаўцаў, але і выкарыстоўваць яго.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# Правила проведения Рекламной игры «Айфономания. Тур 3»

В настоящих правилах проведения рекламной игры **«Айфономания. Тур 3»** (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

**Товары-партнеры** – товары, указанные в таблице № 1 п. 8 настоящих Правил, а также на сайте интернет-магазина www.e-dostavka.by.

**Рекламный игровой код** – это семизначное число, которое присваивается участнику при соблюдении правил участия в Рекламной игре «Айфономания. Тур 3» (далее – Рекламная игра, Игра).

**Розыгрыш** – розыгрыш Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной игры.

**Участник** – физическое лицо, которое приобрело один или несколько Товаров-партнеров и выполнило требования, необходимые для участия в Рекламной игре.

**Кассовый (товарный) чек** – документ, подтверждающий факт приобретения товаров, в том числе одного или нескольких Товаров-партнеров, который должен содержать сведения о номере документа, наименование продавца, дату продажи, наименование, количество и цену товара, итоговую сумму.

Фактом покупки товара в интернет-магазине www.e-dostavka.bv является факт выдачи продавцом кассового и/или товарного чека после оплаты товара покупателем (получателем).

**Персональные данные** – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать (или проверить) в личном кабинете, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно),
- адрес электронной почты (желательно);
- абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи Участника в международном формате (обязательно).

**Сайт интернет-магазина – www.e-dostavka.by.**

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «АМК «РЭПКА», юридическое лицо согласно законодательству Республики Беларусь с местонахождением по адресу: г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21, УНП 191728827, зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом Республики Беларусь решением от 23 августа 2012 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей.

**2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «ИНТЕРНЕТ-МАГАЗИН ЕВРООПТ», Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Западный промузел, ТЭЦ-4, каб. 229.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь или национальный паспорт той страны, гражданином которой он является, или документ, подтверждающий личность (для лиц без гражданства), и постоянно проживающие или пребывающие в Республике Беларусь, достигшие 18 лет (далее по тексту – Участники).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Наименование Рекламной игры: «Айфономания. Тур 3».**

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 17 февраля 2020 г.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 24 марта 2020 г.

**8. Наименования товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра**: товары, реализуемые в интернет-магазине e-dostavka.by на территории Республики Беларусь, с обязательной покупкой одного или нескольких следующих Товаров-партнеров:

Таблица № 1:

| № п/п | Наименование товара | Количество начисляемых Игровых кодов |
|---|---|---|
| 1 | Йогурт «Простоквашино» с клубникой с массовой долей жира 2,5 % 335 г | 2 |
| 2 | Йогурт «Простоквашино» с черникой с массовой долей жира 2,5 % 335 г | 2 |
| 3 | Йогурт «Простоквашино» с вишней с массовой долей жира 2,5 % 335 г | 2 |
| 4 | Масло сливочное с массовой долей жира 82,5 %, 180 г. Высший сорт. т. з. «Простоквашино» | 2 |
| 5 | Масло сливочное «Крестьянское» с массовой долей жира 72,5 %, 180 г. Высший сорт. т. з. «Простоквашино» | 2 |
| 6 | Молоко питьевое ультрапастеризованное т. з. «Простоквашино» с м. д. ж. 0,5 %, 950 мл | 2 |
| 7 | Молоко питьевое ультрапастеризованное т. з. «Простоквашино» с м. д. ж. 1,5 %, 950 мл | 2 |
| 8 | Молоко питьевое ультрапастеризованное т. з. «Простоквашино», массовая доля жира 2,5 %, 930 мл | 2 |
| 9 | Молоко питьевое ультрапастеризованное т. з. «Простоквашино» с м. д. ж. 2,5 %, 950 мл | 2 |
| 10 | Молоко питьевое ультрапастеризованное т. з. «Простоквашино», массовая доля жира 3,2 %, 930 мл | 2 |
| 11 | Молоко питьевое ультрапастеризованное т. з. «Простоквашино» с м. д. ж. 3,2 %, 950 мл | 2 |
| 12 | «Простоквашино» Сливки ультрапастеризованные 10 % 200 г | 1 |
| 13 | «Простоквашино» Сливки ультрапастеризованные 20 % 200 г | 1 |
| 14 | Сметана, массовая доля жира 10,0 %, 350 г т. з. «Простоквашино» | 2 |
| 15 | Биосметана, массовая доля жира 15,0 %, 180 г т. з. «Простоквашино» | 1 |
| 16 | Биосметана, массовая доля жира 15,0 %, 350 г т. з. «Простоквашино» | 2 |
| 17 | Биосметана, массовая доля жира 20,0 %, 180 г т. з. «Простоквашино» | 1 |
| 18 | Биосметана, массовая доля жира 20,0 %, 350 г т. з. «Простоквашино» | 2 |
| 19 | Сметана, массовая доля жира 25,0 %, 180 г т. з. «Простоквашино» | 1 |
| 20 | Сметана, массовая доля жира 25,0 %, 350 г т. з. «Простоквашино» | 2 |
| 21 | Сырок глазированный «Простоквашино» с массовой долей жира 23 %, с ароматом ванилина, 40 г | 1 |
| 22 | Сырок глазированный «Простоквашино» с массовой долей жира 23 % с начинкой молоко сгущенное вареное, 40 г | 1 |
| 23 | Творог «Простоквашино» с массовой долей жира 5 %, 180 г | 2 |
| 24 | Творог с м. д. ж 5 %, т. з. «Простоквашино», 355 г | 2 |
| 25 | Творог «Простоквашино» с массовой долей жира 9 %, 180 г | 2 |
| 26 | Творог с м. д. ж 9 %, т. з. «Простоквашино», 355 г | 2 |
| 27 | Сырок глазированный «Простоквашино» с массовой долей жира 23 % с какао, 40 г | 1 |
| 28 | Творог «Простоквашино» с массовой долей жира 2 %, 320 г | 2 |
| 29 | Творог «Простоквашино» с массовой долей жира 5 %, 320 г | 2 |
| 30 | Молоко питьевое ультрапастеризованное, т. з. «Простоквашино», массовая доля жира 2,5 %, 480 мл | 1 |
| 31 | Молоко питьевое ультрапастеризованное, т. з. «Простоквашино», массовая доля жира 3,2 %, 480 мл | 1 |
| 32 | Йогурт «Простоквашино» с фруктовым наполнителем «Печеное яблоко-корица», с массовой долей жира 2,5 %, 335 г | 2 |
| 33 | Сливки питьевые ультрапастеризованные, массовая доля жира 10 %, 350 г | 2 |
| 34 | Сливки питьевые ультрапастеризованные, массовая доля жира 20 %, 350 г | 2 |
| 35 | Сыр «Белорусский классический» с массовой долей жира в сухом веществе 45 %, 180 г | 2 |
| 36 | Сыр «Сливочный» с массовой долей жира в сухом веществе 51 %, 180 г | 2 |

Полный перечень Товаров-партнеров, участвующих в Рекламной игре, указан также на сайте интернет-магазина **www.e-dostavka.by.**

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица (ЗАО «ИНТЕРНЕТ-МАГАЗИН ЕВРООПТ») в размере 17 406,90 (семнадцать тысяч четыреста шесть белорусских рублей 90 копеек). Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы (далее – Призы):

Таблица № 2:

| Приз | Кол-во, шт. | Номинал за ед., бел. руб. | Всего стоимость бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Приз 1** | | | |
| Смартфон Apple iPhone 11 PRO Max 64 GB Midnight Green, Model A2218, MWHH2RM/A | 5 | 2612,00 | 13 060,00 |
| Денежное вознаграждение | | 369,38 | 1846,90 |
| **Приз 2** | | | |
| Подарочный сертификат на покупку товаров в интернет-магазине e-dostavka.by, номиналом 50 рублей<br>Срок действия<br>13.03.2020–12.04.2020 | 50 | 50,00 | 2500,00 |
| **ИТОГО:** | | | 17 406,90 |

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо:

- в срок с 17.02.2020 г. по 08.03.2020 г. включительно совершить покупку на сайте интернет-магазина **www.e-dostavka.by** на сумму не менее 70,00 белорусских рублей любых товаров, в том числе 1 либо несколько Товаров-партнеров, указанных в таблице № 1 п. 8 настоящих Правил.

- в срок с 00.00.00 17.02.2020 г. по 23.59.59 08.03.2020 г. достоверно заполнить Персональные данные (либо проверить корректность ранее заполненных данных) и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре в личном кабинете.

В случае если Персональные данные и согласие на участие в рекламных мероприятиях было подтверждено ранее, повторное подтверждение не требуется.

10.2. Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.).

Каждому покупателю, который совершил действия, указанные в п. 10.1 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного, Игровой код на дату и время выдачи продавцом кассового и/или товарного чека после оплаты товара покупателем (получателем).

**11. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших Участников Рекламной игры:**

11.1. В розыгрыше Призов участвуют Игровые коды, начисленные за покупки только тех участников, которые указали необходимые Персональные данные в личном кабинете и подтвердили свое согласие на участие в Рекламной игре в сроки, указанные в п.10.1 настоящих Правил.

11.2. Участник, не выполнивший действия, указанные в п. 10, не участвует в Розыгрыше Призов.

11.3. Розыгрыш Призов проводится в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11, офис 507.

К моменту розыгрыша Призов Организатором формируется Список Игровых кодов по возрастанию, сформированный согласно п. 10.2 настоящих Правил (далее – Список), с указанием фамилии, имени, отчества Участников, даты и времени выдачи продавцом кассового и/или товарного чека, а также даты и времени подтверждения согласия на участие в Рекламной игре. Все Игровые коды имеют одинаковую разрядность.

Таблица № 3:

| Дата и время розыгрыша | Участвуют Игровые коды, присвоенные за покупку, совершенную в период | Участник подтвердил свое участие в Игре, заполнив Персональные данные в личном кабинете | Призы для розыгрыша |
|---|---|---|---|
| 13.03.2020, в 12.00 | С 17.02.2020 (00.00.00) по 08.03.2020 (23.59.59) | Не позднее 23.59.59 08.03.2020 | Приз 1, 5 штук; Приз 2, 50 штук |

Вышеуказанные Призы разыгрываются в порядке, указанном в Таблице № 3.

11.4. Определение победителей Призов «Приз 1», «Приз 2»:

Для проведения розыгрыша используется лототрон и 10 одинаковых непрозрачных шаров с цифрами от 0 до 9 внутри. Определение номеров Победителей происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Для определения первой слева цифры номера Победителя лицо, проводящее розыгрыш, помещает в лототрон шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера Участника согласно соответствующему списку. Шары перемешиваются, из лототрона путем случайной выборки извлекается шар, номер которого определяет искомую цифру. Для определения второй и последующих цифр номера Победителя в лототрон загружаются все десять шаров. После извлечения каждого шара производится проверка на соответствие полученной комбинации цифр номеру Участника согласно соответствующему списку. При отсутствии полученной комбинации цифр в номерах по списку извлеченный шар не возвращается в лототрон, а лицо, проводящее розыгрыш, извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация не совпадет с номером Участника по списку. Процедура повторяется до определения 5 (пяти) Победителей Приза 1 и 50 (пятидесяти) Победителей Приза 2.

11.5. Результат Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, подписанном присутствующими на заседании членами комиссии.

**12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша.**

12.1. Победители Призов «Приз 1» и «Приз 2» извещаются о выигрыше не позднее 17.03.2020 посредством уведомления на адрес электронной почты, указанный при регистрации в личном кабинете на сайте интернет-магазина, а также SMS-рассылки на абонентские номера мобильных телефонов сотовых операторов.

12.2. Для получения Призов Победителям необходимо выполнить следующие действия:

- для получения Приза 2 Победителю необходимо осуществить активацию электронного подарочного сертификата в разделе «Мои промокоды» в личном кабинете на сайте интернет-магазина при совершении покупки в срок не позднее 12.04.2020. Подарочные сертификаты будут доступны для активации в личном кабинете Победителя в день розыгрыша.

- Для получения Приза 1 Победитель должен приехать в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11–508 в будние дни с 10.00 до 16.00 в период с 18 марта 2020 года по 24 марта 2020 года, а также в субботу 21 марта 2020 года с 10.00 до 13.00, предварительно связавшись с Организатором по телефонам: +375 17 363 02 76, +375 17 363 12 78.

12.3. Для получения Приза 1 Победитель обязан предъявить паспорт гражданина Республики Беларусь (или вид на жительство), национальный паспорт той страны, гражданином которой он является, или документ, подтверждающий личность (для лиц без гражданства), а также подписать все необходимые документы, связанные с получением приза.

12.4. В соответствии с главой 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Приза 1 выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из денежных средств Приза 1.

12.5. Организатор не оплачивает Победителям Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения призов.

12.6. В случае если Победителем Рекламной игры является несовершеннолетний Участник, призы выдаются законному представителю (родителю, усыновителю, попечителю) при предъявлении паспорта гражданина Республики Беларусь / вида на жительство на территории Республики Беларусь законного представителя и свидетельства о рождении ребенка (иного документа, подтверждающего представительство несовершеннолетнего лица).

12.7. В случае если Победитель не может получить Приз 1 лично, Приз 1 может получить его доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство) и доверенности от Победителя, заверенной нотариально, а также подписать все необходимые документы, связанные с получением приза.

12.8. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

12.9. Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с призами, возникшие после передачи Победителям.

12.10. В случае если призы не получены в установленные Правилами Рекламной игры сроки, призы остаются в распоряжении Организатора.

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры, регламент деятельности.**

13.1. Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

- Зорина Мария Сергеевна, специалист по маркетингу, ЗАО «Интернет-магазин Евроопт»;
- Юрченко Артем Григорьевич, начальник отдела маркетинга, ЗАО «Интернет-магазин Евроопт»;
- Прыгунова Ольга Юрьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;
- Чикилева Елена Александровна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА»;
- Костюк Дарья Валерьевна, специалист по маркетингу ООО «АМК «РЭПКА».

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

14.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 21.03.2020 включительно.

14.3. Имена Победителей Рекламной игры будут размещены на сайте Интернет-магазина.

14.4. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить по телефону горячей линии: 440 с 08.30 до 20.30.

**15. Прочие условия.**

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

15.2. Участники Рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые для получения выигрыша документы, предоставляемые Организатором Рекламной игры.

15.3. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и(или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

15.4. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

15.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

15.6. Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 20/11–509.

*Свидетельство № 3741 о регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 7 февраля 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Агролизинг», 220005, г. Минск, ул. Красная, 13–31, +37517-242-13-81 |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Административное помещение** (Административное помещение) по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 4-1Н | 884 кв. м | 500/D-70779533 |
| Обременение: частичная аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 095 377,14 доллара США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)** | | | |
| 2 | **Дискотека, зал игровых автоматов, помещения физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, помещения общественного питания** (помещение многофункциональное) по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 77А-4 | 1002,7 кв. м | 500/D-690153 |
| Обременение: частичная аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 771 761,90 евро (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)** | | | |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30** рабочих дней после проведения аукциона

В случае признания победителем аукциона либо единственным участником, согласившимся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов, хозяйствующего субъекта, до совершения сделки, будет требоваться согласие антимонопольного органа (Министерства антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь) на экономическую концентрацию

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена **в течение 30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 17.09.2019 г.

**Аукцион состоится 12.03.2020 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.03.2020 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**
**Продавец:** ООО «Апрель Сити» (УНП 191197208), г. Минск, пр-т Партизанский, д. 23а, пом. 1Н, офис 62, в лице управляющего по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) частного предприятия «Гетман и Партнеры», тел. +37529 674-58-10.
Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 326-1Б/2019 в экономическом суде г. Минска будут проведены **17 марта 2020 г**. **с 9.00 до 16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Минимальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 500/D-708107084 в г. Минске по ул. Севастопольская, 57, квартира 1 (обременение – запрет на совершение регистрационных действий) | 424 000,00 | 296 800,00 |
| 2 | Изолированное помещение с инв. № 500/D-708107086 в г. Минске по ул. Севастопольская, 57, квартира 3 (обременение – запрет на совершение регистрационных действий) | 409 000,00 | 286 300,00 |
| 3 | Изолированное помещение с инв. № 500/D-708113590 в г. Минске по ул. Космонавтов, 4, административное помещение 109 | 116 000,00 | 81 200,00 |
| 4 | Изолированное помещение с инв. № 500/D-708113600 в г. Минске по ул. Космонавтов, 6, административное помещение 112 | 129 000,00 | 90 300,00 |
| Тел. для осмотра +37529 698-53-53 | | | |

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 16.02.2020 г. 09.00 по 16.03.2020 г. 17.00: 1. Зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY.** 2. Перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, заключить договор купли-продажи не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов.

# КАХАННЕ І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

## Чаму траціць папулярнасць карнавал у Венецыі?

**Учора ў Венецыі адбыліся рамантычна-тэматычныя «перфомансы» з нагоды Дня закаханых. Сёння ў горадзе пройдзе феерычная фіеста, якая распачнецца на востраве Сан-П'етра дзі Кастэла, а фінішуе на плошчы Сан-Марка. Заўтра тут можна будзе пабачыць палёт анёла, які спусціцца са стаметровай кампанілы (званіцы) легендарнага сабора, дзе захоўваюцца мошчы таго самага евангеліста. На гэтым, вядома ж, дзівосы не скончацца — у Венецыі цяпер у самым разгары сусветна вядомы карнавал. Праўда, турыстаў зараз адчувальна менш, чым звычайна. Чаму траціць папулярнасць Carnevale di Venezia?**

### З гісторыі свята

Адметна, што слова «карнавал» вытворнае ад двух лацінскіх — carno (мяса) і vale (бывай). Гэтае свята спрадвеку з'яўлялася своеасаблівай мяжой, за якой пачынаўся Вялікі пост. Аднак, як сцвярджаюць эксперты, вытокі карнавалу ляжаць яшчэ ў паганскіх цырымоніях у гонар старажытнаегіпецкага бога Асірыса і ў рымскіх сатурналіях. Падчас урачыстасцяў рабам дазвалялася сядзець за адным сталом з гаспадарамі, і, каб саслоўныя забабоны не перашкаджалі зносінам, твары хавалі пад маскамі. Калі на змену паганству прыйшло хрысціянства, на многія традыцыі і святы была накладзена забарона. Трапіў пад яе і карнавал. Але прайшлі стагоддзі, наступіла эпоха Адраджэння, і ў змрочную атмасферу запалоханай інквізіцыяй Еўропы свежым брызам уварвалася сапраўднае свята.

Гісторыя Венецыі пачалася больш чым паўтара тысячагоддзя таму — у сярэдзіне V стагоддзя, калі жыхары «цвёрдай зямлі» знайшлі сярод вады схованку ад варварскіх набегаў. Сучасная Венецыя размешчана на 119 астравах, акружаных 150 каналамі, якія злучаны паміж сабой 400 мастамі. Тутэйшы карнавал мае амаль тысячагадовую гісторыю. Першая дакументальная згадка пра яго адносіцца да 1094-га. Жыхары Венецыянскай рэспублікі тады гучна адсвяткавалі атрыманне падатковых прывілеяў, якія давалі ім велізарныя перавагі для міжземнаморскага гандлю. Залатым часам для карнавалу стала XVIII стагоддзе: тыдзень куртуазныя дамы і кавалеры маглі беспакарана аддавацца радасцям жыцця, схаваўшы свой твар пад маскай. Аднак пасля рэвалюцыйных падзей канца стагоддзя італьянцам стала не да маскарадаў. У 1930-я Беніта Мусаліні забараніў карнавальныя маскі і святы.

Вета было адменена толькі ў 1979 годзе па ініцыятыве рэжысёра Федэрыка Феліні з дазволу Папы Рымскага. Італьянскі ўрад абвясціў аднаўленне штогадовых карнавалаў, абраўшы гэтае мерапрыемства сродкам для папулярызацыі гісторыі і культуры Венецыі. Штогод у горад на свята з'язджалася больш за паўмільёна турыстаў. Дарэчы, у Венецыянскага карнавалу ёсць нават уласны гімн, напісаны вядомым куцюр'е П'ерам Кардэнам.

### 18 дзён вар'яцтва

У карнавальных працэсіях удзельнічаюць тысячы людзей у касцюмах і масках. Яны робяцца са скуры або пап'е-машэ, размалёўваюцца з выкарыстаннем грунту і сусальнага золата, упрыгожваюцца птушынымі пёрамі і каштоўнымі камянямі.

Калі на вулічным свяце можна абмежавацца толькі маскай, то з'яўляцца на прыёме ў Palazzo без касцюма проста непрыстойна. Нярэдка ў адмысловых запрашэннях спецыяльна пазначаецца дрэс-код: у якім стылі і якога часу павінна быць адзенне. Некаторыя еўрапейцы спецыяльна прывозяць на карнавал ашаламляльныя касцюмы, якія ім некалькі месяцаў шылі самыя ўмелыя краўцы і якія часам каштуюць дзясяткі тысяч еўра. Але асноўная маса турыстаўператвараецца ў Пульчынэл і П'ерэт проста ў Венецыі, дзе ёсць мноства крам, якія прапануюць неабходнае адзенне і рэквізіт.

Сёлета першыя пераадзетыя пачалі збірацца на цэнтральнай плошчы Венецыі ў канцы мінулага тыдня. Дамы ў гістарычных сукенках і масках



у суправаджэнні кавалераў у парыках з'ехаліся з усёй Італіі і з іншых краін. Афіцыйны старт карнавалу быў зададзены традыцыйным шэсцем па каналах на гандолах і лодках. Як паведамляецца на афіцыйным сайце мерапрыемства, тэма гэтага года — «Гульня, каханне і вар'яцтва». На думку Масіма Кекета, новага мастацкага кіраўніка карнавала, каханне часта суправаджаецца вар'яцтвам.

Усяго да 25 лютага — «тлустага аўторка» перад пачаткам Вялікага посту — запланавана каля 150 выступленняў, канцэртаў, баляў, у якіх возьме ўдзел больш за 300 артыстаў. Мерапрыемствы карнавала ахопяць не толькі гістарычную частку астраўной Венецыі, але і мацерыковыя кварталы Мастра і Маргера. Агульны бюджэт свята склаў два мільёны еўра, якія ў асноўным паступілі ад спонсараў і партнёраў мэрыі.

### Пад наглядам

Напярэдадні знакавай падзеі мясцовыя ўлады пачалі выпрабоўваць новую сістэму маніторынгу турыстаў, якая заклікана змагацца з перапоўненасцю горада ў гадзіны пік. Уздоўж самых ажыўленых вуліц Венецыі на будынках і ліхтарах устаноўлены 34 стэрэаскапічныя камеры з датчыкамі. Яны будуць фіксаваць велічыню турыстычнага патоку.

Сістэма дазваляе распазнаваць сілуэты людзей, іх пол і ўзрост. Акрамя таго, яна будзе перахопліваць сігналы мабільных тэлефонаў, каб вызначыць, адкуль прыехаў турыст і як доўга ён знаходзіцца ў Венецыі. Эксперымент па падліку турыстаў будзе праводзіцца да 25 лютага. Інфармацыя з датчыкаў трапляе на камп'ютар у аддзяленне гарадской паліцыі, дзе звесткі адлюстроўваюцца ў выглядзе графікаў і лічбаў — шчыльнасць руху на вуліцах Венецыі, колькасць турыстаў. Па словах саветніка па турызме Венецыі Паалы Мар, абапіраючыся на паказанні прыбораў, можна будзе рэгуляваць турпаток. «Мы зможам загадзя перанакіраваць турыстаў на іншыя маршруты, каб пазбегнуць натоўпаў на асабліва ажыўленых вуліцах горада», — заўважыла спецыяліст. Новая сістэма адсочвання турыстаў пакуль не даказала сваю карыснасць: спатрэбіцца час, каб апрацаваць усе атрыманыя звесткі. Тым не менш улады ўпэўненыя, што яна дапаможа знізіць напружанасць, якая нарастае паміж мясцовымі жыхарамі і гасцямі горада.

Як паведаміла Паала Мар, штодня Венецыю наведвае каля 60 тысяч турыстаў, і аўтаматызаваная сістэма дапаможа вырашыць шэраг праблем, звязаных з овертурызмам, у прыватнасці дакладна вызначыць часовыя межы «нізкага» і «высокага» сезонаў. Ад гэтага будзе залежаць, колькі турыст заплаціць за ўезд у горад. Адпаведны падатак пачне працаваць у Венецыі 1 ліпеня. Ён закране турыстаў, якія прыбываюць у горад у рамках аднадзённай экскурсіі ці на некалькі дзён на самалётах, круізных лайнерах, аўтобусах і іншым транспартам. Памер новага падатку будзе вар'іравацца ў залежнасці ад сезону. Так, з лістапада да красавіка збор складзе 3 еўра, з мая да кастрычніка — 8 еўра, а ў летнія выхадныя і ў перыяд карнавалу — 10 еўра. Раней улады горада прынялі рашэнне аб устанаўленні колькасных абмежаванняў для турыстаў. Так, на цэнтральнай плошчы Сан-Марка ліміт наведванняў складае 65 тысяч чалавек у дзень. На некаторых вуліцах Венецыі стаяць турнікеты, якія разлічаны на праход вызначанай колькасці гасцей горада.

### Паводка і каранавірус

Муніцыпалітэт з цяжкасцю спраўляецца з тонамі смецця, які пакідаюць аматары пікнікоў на венецыянскіх каналах. Вуліцы Венецыі запаланілі крамы вядомых брэндаў, сеткавыя кавярні і крамы, якія гандлююць таннымі сувенірамі, вырабленымі ў Кітаі. Спадчынныя венецыянскія майстры з іх унікальнымі, але нятаннымі вырабамі аказваюцца на абочыне. П'ера Дры — адзін з пяці ў свеце майстроў па вырабе вёслаў для гандол. Больш за дзесяць гадоў таму ён кінуў кар'еру астранома і вырашыў асвоіць рамяство сваіх продкаў. «Шмат, занадта шмат гадоў людзі думалі толькі пра хуткія грошы і масавы турызм. Але так мы губляем нашы традыцыі і нашу зямлю. Наша пакаленне ў адказе за тое, каб паспрабаваць штосьці змяніць у Венецыі», — з горыччу заўважыў П'ера карэспандэнту «Бі-бі-сі».

У той жа час колькасць жыхароў Венецыі скарачаецца на паўтары тысячы чалавек у год. У горадзе зачыняюцца так патрэбныя юрыдычныя канторы, медыцынскія офісы і звычайныя прадуктовыя крамы. На іх месцы вырастаюць гасцініцы. У выніку мясцовыя жыхары — асабліва моладзь — пераязджаюць на «мацярык». Насельніцтва Венецыі імкліва старэе. Некаторыя лічаць, што гораду дапаможа аўтаномія. Іншыя, наадварот, бачаць у гэтым пагрозу. Сыходзяцца ў адным: калі пакінуць усё як ёсць, прыгоствы Венецыі могуць не захавацца для наступных пакаленняў.

Традыцыйна карнавал з'яўляецца адным з самых ажыўленых перыядаў года ў Венецыі, калі тысячы наведвальнікаў прыязджаюць з усяго свету, а ўсе атэлі забраніраваны задоўга да яго пачатку. Аднак сёлета колькасць турыстаў у горадзе прыкметна скарацілася. Многія наогул вырашылі застацца ўбаку ад свята пасля разбуральных паводак, якія адбыліся ў Венецыі восенню мінулага года, іншыя пазбягаюць падарожжаў з-за апасення заражэння каранавірусам. Гасцініцы цяпер у сярэднім забраніраваны толькі на 70 працэнтаў, а вечарынкі і балі з маскамі, якія праводзяцца штогод падчас карнавалу, адмененыя, у тым ліку славутая вечарынка Ballo del Doge, з прычыны недахопу гасцей. Так што овертурызм Венецыі не пагражае. Прынамсі, пакуль.

**Захар БУРАК.**

Напярэдадні падзеі

## Раўбічы прымуць чэмпіянат Еўропы па біятлоне

**Першапачаткова кантынентальнае першынство павінна было прайсці ў эстонскім Отэпя, але турнір перанесены ў Беларусь, таму што з-за цёплага надвор'я арганізатары не змаглі гарантаваць умовы, неабходныя для мерапрыемства.**

**У той час як Міністэрства спорту і турызму Беларусі і прадстаўнікі РЦАП «Раўбічы» заявілі пра гатоўнасць прыняць форум.**

**Спартыўны дырэктар IBU Фелікс БІТЭРЛІНГ** падзякаваў беларускаму боку за такое рашэнне. «Паколькі неўзабаве ў Беларусі пройдзе фінал Кубка IBU, гэтае рашэнне з'яўляецца найбольш правільным і эканамічна эфектыўным для спартсменаў, арганізатараў і нацыянальных федэрацый». Ён таксама адзначыў, што мерапрыемства стане добрай падрыхтоўкай для Беларусі, таму што ў сакавіку 2022 года Раўбічы будуць прымаць Кубак свету.

Правядзенне чэмпіянату Еўропы па біятлоне ў Раўбічах не патрабуе дадатковых фінансавых укладанняў, расказаў **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту Аляксандр ГАГІЕЎ.** «Па самых сціплых разліках, мы атрымаем у два з паловай разы больш грошай, чым пойдзе на арганізацыю чэмпіянату Еўропы. Да нас прыедуць прадстаўнікі каля 35 каманд. Гэта прыблізна 500 удзельнікаў на этап Кубка IBU, столькі ж на чэмпіянат Еўропы. Людзі плацяць за ўсё самі. Ні капейкі дадаткова з бюджэту звыш таго, што запланавана на Кубак IBU, на арганізацыю чэмпіянату Еўропы не пойдзе», — растлумачыў Гагіеў.

Адзначым, што такім чынам чэмпіянат Еўропы другі год запар будзе праходзіць у беларускіх Раўбічах. Спаборніцтвы пачнуцца 26 лютага і скончацца 1 сакавіка.

# ВЯЛІКАЯ РАЗМОВА ПРА СПОРТ

**На калегіі Міністэрства спорту і турызму былі падведзены вынікі работы галіны за мінулы год і вызначаны асноўныя задачы на год цяперашні.**

### 843 МЕДАЛІ ЗА 365 ДЗЁН

У 2019 годзе на тэрыторыі Беларусі было праведзена прыблізна 90 міжнародных спартыўных спаборніцтваў рангу чэмпіянатаў свету, этапаў Кубка свету, чэмпіянатаў Еўропы і адкрытых першынстваў па розных відах спорту. А за межамі краіны нашы спартсмены ўзялі ўдзел у 83 чэмпіянатах свету і 113 чэмпіянатах Еўропы. Калі дадаць да гэтага ліку этапы Кубкаў свету і Еўропы, адкрытыя першынствы, адборачныя турніры і іншыя міжнародныя спаборніцтвы, а таксама вучэбна-трэніровачныя зборы, атрымліваецца больш за 300 мерапрыемстваў. На іх беларусы заваявалі 843 медалі (248 залатых, 277 сярэбраных і 318 бронзавых), з іх у алімпійскіх відах спорту — 359 узнагарод. Больш за палову пералічаных медалёў на рахунку маладзёжнага, юніёрскага і юнацкага складаў. «За бягучы алімпійскі цыкл з'явіўся цэлы шэраг перспектыўных спартсменаў, якія ўпэўнена ўліваюцца ў асноўны склад нацыянальных і зборных камандаў, яны ўжо адзначыліся высокімі вынікамі на буйных міжнародных спаборніцтвах», — пракаментаваў такі вынік **міністр спорту і турызму краіны Сяргей КАВАЛЬЧУК.**

**Віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА** таксама адзначыў, што мінулы год стаў яркім на значныя спартыўныя падзеі. «Вядучыя міжнародныя арганізацыі пераканаліся, што мы ў стане арганізаваць і правесці любое маштабнае мерапрыемства на самым высокім узроўні. Маючы такі каласальны вопыт, мы мусім разумець, што падобныя форумы павінны рабіць істотны ўнёсак у нацыянальную эканоміку, а не толькі ва ўмацаванне іміджу краіны на міжнароднай арэне», — сказаў ён.

2020 год будзе не менш насычаны, у ім Беларусь правядзе камандны чэмпіянат Еўропы па спартыўнай хадзе (май), чэмпіянат Еўропы па фехтаванні (чэрвень), чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ сярод студэнтаў (жнівень) і фінал Кубка свету па шахматах сярод жанчын (верасень, кастрычнік). Акрамя таго, краіна працягвае планамерную падрыхтоўку да мерапрыемстваў 2021 года — чэмпіянату свету па хакеі з шайбай, чэмпіянату свету па сучасным пяцібор'і і каманднага чэмпіянату Еўропы па лёгкай атлетыцы.

### 100—110 АЛІМПІЙСКІХ ЛІЦЭНЗІЙ

Аднак галоўны экзамен 2020 года — гэта XXXII летнія Алімпійскія гульні ў Токіа. Падрыхтоўку да галоўных стартаў чатырохгоддзя цяпер ажыццяўляюць 263 беларускія спартсмены па 27 відах спорту. На цяперашні момант алімпійскія кваліфікацыйныя патрабаванні і нарматывы выканалі ўжо 69 беларусаў у 15 відах спорту. Але барацьба за правы паехаць у Токіа будзе працягвацца да канца чэрвеня 2020 года, таму рэальна разлічваць на заваяванне 100—110 алімпійскіх ліцэнзій, лічыць Сяргей Кавальчук. «Патрабаванні да адбору на Гульні сталі больш жорсткія. Нягледзячы на гэта, мы ідзём па графіку мінулага алімпійскага чатырохгоддзя, — адзначыў ён. — Мы бачым, што на старты ў Токіа акрамя 69 спартсменаў, якія ўжо выканалі нарматывы, могуць адабрацца яшчэ каля 30 чалавек. Хтосьці зробіць гэта па рэйтынгу, хтосьці зможа выйграць ліцэнзію на адборачных турнірах. Адпаведная работа вядзецца. Калі такіх спартсменаў будзе больш, значыць, для нас жа будзе лепш», — адзначыў міністр і падкрэсліў, што «адна з першарадных задач — выключыць пападанне допінгу ў арганізм спартсмена. Інакш быць бядзе».

З гэтай нагоды Сяргей Кавальчук расказаў пра папераджальныя меры. У прыватнасці, замацаваны новы парадак набыцця фармакалагічных прэпаратаў для нацыянальных і зборных камандаў — цэнтралізавана праз РНПЦ спорту. Таксама прыняты шэраг змяненняў у заканадаўства, якія прадугледжваюць меры адказнасці за допінг у спорце, як спартсменаў і іх персаналу, так і федэрацый па відах спорту. Сярод падобных мер — адмена грашовых узнагарод і стыпендый Прэзідэнта за спартыўныя вынікі, дасягнутыя з прымяненнем допінгу, пазбаўленне дзяржаўных узнагарод і пазбаўленне федэрацый падтрымкі з боку дзяржавы. Уведзена крымінальная адказнасць за схіленне спартсменаў да ўжывання і выкарыстанне ў дачыненні да іх забароненых рэчываў і метадаў, а таксама незаконны абарот асобных анабалічных стэроідаў, якія аднесены да спісу моцнадзейных рэчываў. Нацыянальнае антыдопінгавае агенцтва запланавала павелічэнне на 70 працэнтаў колькасці ўзятых у беларускіх спартсменаў допінг-проб.

Ігар Петрышэнка падкрэсліў, што для падрыхтоўкі да Алімпійскіх гульняў у краіне створаны ўсе ўмовы: слова за алімпійцамі. Задача псіхолагаў і трэнераў — данесці гэта да спартсменаў: на Алімпіяду яны едуць не дзеля пацвярджэння свайго найлепшага выніку, а каб паказаць звышвынік, перамагчы. «Але гэта не пра допінг. Кожны, хто мае дачыненне да падрыхтоўкі спартсменаў, павінен разумець, што ўжыванне допінгу — гэта не толькі яго асабістая адказнасць. Кожны такі выпадак — гэта ўдар па іміджы дзяржавы на міжнароднай спартыўнай арэне. І аднавіць яго вельмі складана», — сказаў віцэ-прэм'ер. Ён паставіў задачу ўмацніць кантроль, асабістую адказнасць спартсменаў, трэнераў, кожнага члена каманды і забяспечыць 100-працэнтнае выключэнне ўжывання допінгу, у тым ліку выпадковага.




# Да старту летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа засталося 159 дзён

## У марскім парку Адайба ў Токіа прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя хуткаму старту Алімпіяды

**Афіцыйны прадстаўнік аргкамітэта «Токіа-2020» Маса Такая адзначыла, што за шэсць месяцаў да пачатку ўрачыстай цырымоніі адкрыцця ўсё ідзе па плане. «Цягам апошніх сямі гадоў мы прыклалі шмат намаганняў для падрыхтоўкі да Гульняў. Цяпер бачым, як гэтыя кавалачкі злучаюцца разам. За шэсць месяцаў да пачатку выкананы менавіта той аб'ём работы, які мы і запланавалі», — адзначыла яна.**

XXXII летнія Алімпійскія гульні ў Токіа пройдуць на 43 аб'ектах: 8 новых пастаянных, 25 існуючых і 10 часовых. У снежні 2019 года афіцыйна адкрыты новы Нацыянальны стадыён, на якім ужо адбыліся першыя афіцыйныя спаборніцтвы.

У канцы мінулага года завершана і ўзвядзенне вёскі для атлетаў. Варта адзначыць, што ўсе 26 тысяч ложкаў у вёсцы ўпершыню ў гісторыі Алімпійскіх гульняў і Параалімпійскіх гульняў будуць амаль цалкам зроблены з аднаўляльных матэрыялаў. Матрацы распрацаваны для паляпшэння якасці і камфорту сну, а рамы выраблены з лёгкага кардону з высокім супраціўленнем. Кардонныя рамы надзвычай даўгавечныя, лёгкія, пажарабяспечныя і воданепранікальныя. Пасля Гульняў яны павінны быць перапрацаваныя ў папяровую прадукцыю — так спалучаюцца сучасныя інавацыі з экалагічнай свядомасцю.

Арганізацыйны камітэт Гульняў заявіў аб завяршэнні ў сакавіку бягучага года будаўніцтва Village Plaza — плошчы ў вёсцы атлетаў. Падчас медыятура прадстаўнікам СМІ паказалі пяць кластараў, якія будуць цалкам складацца з дрэва, дастаўленага ў Токіа з 63 муніцыпалітэтаў Японіі. На кожным бруску дрэва надрукавалі назву муніцыпалітэта, што дазваляе наведвальнікам даведацца, з якога раёна матэрыял. Пасля завяршэння Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў драўняныя матэрыялы будуць вернутыя ў рэгіёны для паўторнага выкарыстання.

Як адзначылі арганізатары, будаўніцтва Village Plaza пачалося ў сакавіку мінулага года, і яго плануецца завяршыць у красавіку. Акрамя кавярняў, магазінаў з атрыбутыкай і сувенірнай прадукцыяй Гульняў, у Village Plaza будуць адкрыты цырульня, пошта і хімчыстка.

Таксама арганізацыйны камітэт абвясціў пра гатоўнасць прыняць першых атлетаў у валейбольнай арэне Арыяке — адным з найбуйнейшых крытых спарткомплексаў для маючых адбыцца галоўных стартаў чатырохгоддзя.

Арэна разлічана на 15 тысяч балельшчыкаў і ўведзена ў строй у снежні 2019 года. У студзені там праводзіліся яе тэставыя выпрабаванні.



Валейбол на маючых адбыцца Гульнях будзе адным з самых папулярных відаў спорту. У мужчынскім і жаночым турнірах згуляюць па 12 камандаў. Нагадаем, чэмпіёнамі Гульняў 2016 года з'яўляюцца Бразілія (мужчыны) і Кітай (жанчыны). Упершыню валейбол быў уключаны ў праграму Алімпійскіх гульняў менавіта ў Токіа ў 1964 годзе. Мужчынская каманда Японіі заваявала тады бронзавы медаль, а жаночая — зрабіла сенсацыю, здабыўшы залатую ўзнагароду.

Пасля завяршэння Гульняў гарадскія ўлады пераўтвораць валейбольны комплекс Арыяке ў цэнтр забаў, спорту і культуры. Арэна адпавядае ўсім экалагічным нормам: на аб'екце ўстаноўлены сонечныя батарэі і геатэрмальнае цеплавое абсталяванне, каб дапамагчы знізіць выкіды парніковых газаў.

Актыўна ідзе і продаж квіткоў на маючыя адбыцца Алімпійскія гульні. Больш за 8,2 мільёна чалавек зарэгістравалася на атрыманне білетаў. Балельшчыкі з Беларусі таксама могуць набыць квіткі ў афіцыйнага дылера кампаніі Ticketpro.

Больш за 80 тысяч чалавек у Японіі і за мяжой першапачаткова адабрана для навучання па праграме валанцёрскага руху.

Улічваючы высокую цікавасць да будучых стартаў, арганізатары актыўна супрацоўнічаюць з партнёрамі. Агульная колькасць лакальных алімпійскіх спонсараў Гульняў у Токіа дасягнула 65. Чатыры кампаніі выступаюць у якасці партнёраў па правядзенні эстафеты алімпійскага агню.

Каталог тавараў «Токіа-2020» цяпер змяшчае каля 5 тысяч найменняў прадукцыі. Як адзначылі ў аргкамітэце, у Японіі падчас Гульняў будуць працаваць 72 крамы з атрыбутыкай алімпіяды.

На спартыўных аб'ектах у Токіа ўжо праведзены тэставыя спаборніцтвы, якія праходзяць з верасня 2018 года. З кастрычніка 2019 года да студзеня 2020-га праводзіліся спаборніцтвы ў памяшканні, а трэцяя хваля тэставых спаборніцтваў адбудзецца з лютага да мая бягучага года.

Кузня чэмпіёнаў

# РЭЦЭПТ ПАДРЫХТОЎКІ ПЕРАМОЖЦАЎ

**Бабруйск заўсёды славіўся высокімі спартыўнымі дасягненнямі сваіх жыхароў. Тут сканцэнтраваны дзясяткі спартыўных школ па розных відах спорту, грунтуюцца прафесійныя спартыўныя клубы, і ёсць вучылішча алімпійскага рэзерву, дзе могуць працягваць сваё навучанне таленавітыя спартсмены. Менавіта з Бабруйска выйшлі прызёры самых прэстыжных сусветных турніраў па веславанні, барацьбе, боксе, шахматах, лёгкай і цяжкай атлетыцы. Сакрэт поспеху — у дзіцяча-юнацкіх школах і трэнерах, з якімі будучыя зоркі робяць свае першыя крокі.**


Яўген ЛУКОМСКІ.

Адной з самых вядомых дзіцяча-юнацкіх спартыўных устаноў горада з'яўляецца школа № 3, якая спецыялізуецца на адзінаборствах. Менавіта тут выраслі сярэбраны прызёр алімпійскіх гульняў Сяргей Ліштван, двухразовая чэмпіёнка Еўропы Ванеса Каладзінская і пераможца Еўрапейскіх гульняў Ірына Курачкіна.




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## Асноўная праблема — здароўе дзяцей

СДЮСШ № 3 Бабруйска была заснавана 1 лістапада 1966-га. За 54 гады існавання школа назапасіла багатыя традыцыі ў адзінаборствах. На цяперашні момант тут займаецца амаль 520 дзяцей па такіх кірунках, як жаночая барацьба, мужчынская вольная барацьба, грэка-рымская барацьба, дзюдо і тэквандо. Навучальная ўстанова мае тры залы. Асноўная (зала для барацьбы і трэнажорная зала) знаходзіцца ў новым спальным раёне Бабруйска; паблізу больш няма спартыўных секцый, гэта значыць, выбар дзяцей і бацькоў відавочны. Яшчэ адну залу школа арандуе спецыяльна для заняткаў тэквандо, а трэцяя размешчана ў самым цэнтры горада. Такое размеркаванне аб'ектаў дапамагае ахапіць увесь горад, таму з наборам дзяцей у школы праблем няма.

«У Бабруйску вельмі папулярная барацьба, наша асноўная праблема сёння — гэта здароўе дзяцей, — расказвае **дырэктар СДЮСШ № 3 Яўген ЛУКОМСКІ.** — Перш чым прыйсці на першую трэніроўку, дзіця павінна ўзяць даведку ў свайго ўчастковага ўрача, а ўжо пасля года заняткаў мы вядзем яго ў спартыўны дыспансер, дзе часцяком выяўляецца вельмі шмат нюансаў. Напрыклад, праблемы са зрокам ці скаліёз, якія не дазваляюць дзецям займацца барацьбой ці ўдзельнічаць у спаборніцтвах. Для адзінаборстваў рамкі па здароўі вельмі жорсткія, таму мы працуем з кожным выхаванцам індывідуальна, каб захаваць яго».



Яўген Аляксандравіч адзначае, што часта дзяцей у школу прыводзяць бацькі, якія самі займаліся адзінаборствамі тут жа, — такая пераемнасць пакаленняў стала ўжо звыклая. У групы пачатковай падрыхтоўкі набіраюцца дзеткі з 8-9 гадоў, да гэтага трэнеры рэкамендуюць бацькам аддаваць хлопчыкаў і дзяўчынак у гімнастыку ці плаванне: лепей, калі дзіця прыходзіць на барацьбу ўжо падрыхтаванае, з добрай каардынацыяй рухаў, умеючы рабіць элементарнае перакульванне. Першы год ніхто не вучыць маленькіх спартсменаў кідкам і прыёмам — спачатку яны займаюцца агульнай фізічнай падрыхтоўкай, расцягваюцца. «Сёння нам даводзіцца канкурыраваць толькі з гульнявымі відамі спорту, хоць у нашу праграму трэніровак таксама ўваходзяць розныя віды, напрыклад, летам робім аздараўленчыя лагеры, гуляем у футбол у якасці размінкі перад асноўнымі заняткамі. Стараемся зрабіць трэніроўкі разнастайнымі», — тлумачыць Яўген Лукомскі.

Сваіх выхаванцаў школа адзінаборстваў перадае Бабруйскаму вучылішчу алімпійскага рэзерву і Мінскаму рэспубліканскаму вучылішчу алімпійскага рэзерву. «Туды пераходзяць найлепшыя. У сярэднім штогод мы накіроўваем у гэтыя ўстановы каля 10 чалавек, гэта вялікі паказчык», — адзначае дырэктар. Дадаючы, што паспрабаваць барацьбу можа кожнае дзіця, таму што ў школу прымаюць усіх. Каб у малых была добрая матывацыя, кіраўнікі імкнуцца часта ладзіць розныя спаборніцтвы — гэта не толькі турніры, якія прадугледжвае гарадскі каляндар мерапрыемстваў, але і спаборніцтвы, якія прыдумвае сама школа, запрашаючы на іх спартсменаў са Жлобіна і Мар'інай Горкі, напрыклад. «Пасля такіх турніраў дзеці прыносяць свае медалі ў школу, аднакласнікі іх бачаць і таксама прыходзяць да нас», — адзначае Яўген Аляксандравіч.

## Поспехаў дамагаюцца вялікай працай

Сёння давесці дзіця да вучылішча алімпійскага рэзерву досыць складана, кажа дырэктар: дзецям з забяспечаных сем'яў спорт часта становіцца нецікавы. Вопытам і часам даказана, што менавіта дзеці з сем'яў з невялікім дастаткам дамагаюцца большага выніку. «Яны больш імкнуцца, ім цікава кудысьці выехаць, паглядзець новыя гарады, атрымаць тыя ж сутачныя», — тлумачыць Яўген Лукомскі. Хоць барацьба — адзін з самых недарагіх відаў спорту і з гэтага пункту гледжання таксама даступная кожнаму. Для заняткаў дзіцяці патрэбен толькі лёгкі спартыўны касцюм для трэніровак на вуліцы і трыко.

«Поспехаў дамагаюцца вялікай працай, падборам людзей з добрым розумам і фізічнай структурай цела, — адзначае **трэнер па грэка-рымскай барацьбе СДЮСШ № 3 Уладзімір САВАЛЁЎ.** — Адразу, у дзіцяці, гэтага можна і не разгледзець, але з 15-16 гадоў ужо відаць. Мы часта выйграем спартакіяду школьнікаў, але барацьба — гэта хвалепадобны спорт, таму ў нейкія гады нашы выхаванцы на ўздыме, у іншыя адбываецца правал. Наогул, працуючы трэнерам больш за 20 гадоў, магу сказаць: чым далей, тым болей паніжаецца ўзровень здароўя дзяцей. Цяпер у іх практычна ў кожнага нейкі дыягназ. Раней было менш усялякіх спакус, дзеці ішлі на барацьбу больш ахвотна, праз мае рукі прайшлі сотні. Самае складанае ў рабоце з дзецьмі — утрымаць на высокім узроўні таленавітых. Некаторыя сыходзяць, таму што складана: барацьба — няпросты від спорту, цяжкі для дзяцей. Але хто схільны, таго не выганіш. Гэта ўнутранае пачуццё кожнага чалавека, да справы павінна ляжаць душа. Бацькі сталі больш абыякавыя, таму што прыходзіць шмат вельмі добрых дзяцей, але з боку іх сем'яў належнай падтрымкі і стымулявання няма».

Сёння вучні Уладзіміра Іосіфавіча выступаюць на рэспубліканскіх, еўрапейскіх і сусветных стартах, у СДЮСШ № 3 і падчас нашага візіту з вялікай цікавасцю сачылі за чэмпіянатам Еўропы, які праходзіць у гэтыя дні. Тут заўсёды рады былым выхаванцам — хтосьці вяртаецца ў сваю родную школу, каб правесці майстар-класы, а хтосьці ў ролі трэнера. Наогул, з кадрамі ў Бабруйску ўсё гладка, у школе адзінаборстваў цяпер працуюць 24 настаўнікі. Такіх вопытных спецыялістаў, як Уладзімір Іосіфавіч, няшмат, аснова — гэта моладзь. «Стараемся ўтрымаць маладых, зацікавіць прэміямі, дапамагаем з інтэрнатам. У асноўным стараемся браць сваіх жа вучняў», — расказвае Яўген Лукомскі, які, дарэчы, сам выхаванец бабруйскай школы адзінаборстваў. Ён прыйшоў сюды ў 10 гадоў, пасля паступіў у вучылішча алімпійскага рэзерву, вярнуўся ў СДЮСШ № 3 і працаваў трэнерам, а потым ужо стаў дырэктарам.

*Мінск — Бабруйск — Мінск.*

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## об открытом аукционе по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Кобринском районе Брестской области 19 марта 2020 года в 11.00

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | п. Фруктовый, ул. Луговая, 25, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380404601000313 | 0,1399 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 6000 | 600 | 1814,68* |
| 2 | п. Фруктовый ул. Луговая, 27, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380404601000314 | 0,1424 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 6000 | 600 | 1725,75* |
| 3 | д. Мельники ул. Центральная, 25, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380402601000053 | 0,1451 | Обеспеченность (возможность) подключения электроснабжения | 5000 | 500 | 1384,17* |
| 4 | ул. Сосновая, 1, г. Кобрин | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001008292 | 0,1028 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения | 16 000 | 1600 | 1493,50* |
| 5 | ул. Сосновая, 3, г. Кобрин | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001008293 | 0,1000 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения | 15 500 | 1550 | 1491,66* |
| 6 | ул. Сосновая, 5, г. Кобрин | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124350100001008313 | 0,1000 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения | 15 500 | 1550 | 1493,50* |

Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ

Организатор аукционов – Кобринский районный исполнительный комитет

**Аукцион состоится 19 марта 2020 года в 11.00** по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.

Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

Последний день приема заявлений – 13 марта 2020 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.

Продажа земельных участков осуществляется гражданам Республики Беларусь.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

На основании подпункта 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, предоставленному для строительства одноквартирного жилого дома в районах индивидуальной жилой застройки, подлежат возмещению в порядке, установленном Положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014 г. № 298.

Затраты, возмещаемые победителем аукциона, являющимся застройщиком жилого дома, возмещаются при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома либо до ввода в эксплуатацию жилого дома с учетом индексации.

Ориентировочная величина затрат, возмещаемых гражданином, являющимся застройщиком жилого дома, при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома составляет:
- по лоту № 1 – 4767,74 рубля;
- по лоту № 2 – 4724,98 рубля.

По лотам №№ 3, 4, 5, 6 затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку не имеется.

*Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте* **http://kobrin.brest-region.gov.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## об открытом аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков в Кобринском районе Брестской области 19 марта 2020 года в 11.30

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Киселевецкая, д. Магдалин Киселевецкого сельсовета | Строительство и обслуживание площадки с твердым покрытием для хранения сыпучих строительных материалов (для размещения объектов иного назначения) | 10 лет | 124383004101000555 | 0,5034 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного электроснабжения | 2000 | 200 | 2188,48* |
| 2 | г. Кобрин, ул. Интернациональная, участок (район парка им. А. В. Суворова) | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001005921 | 0,0028 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного электроснабжения и водоснабжения | 4500 | 450 | * |
| 3 | г. Кобрин ул. Матросова, участок № 15 | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001005989 | 0,0087 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного электроснабжения и водоснабжения | 4350 | 435 | * |
| 4 | аг. Дивин, ул. Октябрьская, Кобринский район | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124381702101000013 | 0,0140 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного электроснабжения | 700 | 70 | * |

***Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ.***

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет**

**Аукцион состоится 19 марта 2020 года в 11.30** по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.

Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

**Последний день приема заявлений – 13 марта 2020 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа права заключения договора аренды земельного участка осуществляется индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам.

К участию в аукционе допускаются индивидуальные предприниматели, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победителем аукциона в обязательном порядке вносится плата за право аренды и ежегодная арендной платы за земельный участок, находящийся в государственной собственности. При продлении арендных отношении в обязательном порядке вносится плата за право аренды.

На земельных участках по лотам №№ 2, 3, 4 установлены торговые павильоны, которые будут демонтированы собственниками этих некапитальных строений до обращения победителя аукциона, не являющегося собственником этого строения, за государственной регистрацией прав на земельный участок.

Годовая арендная плата на дату проведения аукциона составляет:
по лоту № 1 – 156,45 рубля;
по лоту № 2 – 10,23 рубля;
по лоту № 3 – 32,96 рубля;
по лоту № 4 – 4,35 рубля.

*Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте* **http://kobrin.brest-region.gov.by**

**Уведомление**
**о созыве очередного общего собрания акционеров**
**ОАО «СТАРАЯ ФАБРИКА»**

